Як прымусіць працаваць «асобны кантынгент»?

МС

СТАР. 3

96 – яшчэ не ўзрост!

СТАР. 4

Мастак з Якімавай Слабады

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 ЛІСТАПАДА 2014 г. СЕРАДА № 214 (27824) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЧАС ХУТКІХ І РАШУЧЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Трэба працаваць у любых умовах і дасягаць вынікаў, аператыўна рэагаваць на змяненні кан'юнктуры і прымаць рашэнні неадкладна

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад урада, Нацыянальнага банка, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама аб рабоце эканомікі за мінулы перыяд 2014 года, ацэнцы вынікаў года і праектах прагнозу бюджэту і грашова-крэдытнай палітыкі на 2015 год, паведамляе БЕЛТА. Кіраўніку дзяржавы, у прыватнасці, далажылі аб развіцці рэальнага сектара беларускай эканомікі, шляхах пераадолення негатыўных тэндэнцый і прапановах па забеспячэнні збалансаванага развіцця Беларусі ў 2015 годзе. У цэнтры ўвагі таксама былі пытанні выканання ў 2014 годзе рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, падатковай палітыкі і фарміравання рэспубліканскага бюджэту на 2015 год. Акрамя таго, Прэзідэнту далажылі аб выкананні Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2014 год і адпаведным праекце на 2015 год.

ДЫНАМІКА З ПЛЮСАМ

У час справаздачы Аляксандр Лукашэнка канстатаваў рост за дзевяць месяцаў як эканомікі Беларусі ў цэлым, так і асноўных яе галін пры валютнай і бюджэтнай збалансаванасці: «Паступова аднаўляецца рост прамысловай вытворчасці, калі гэта можна назваць аднаўленнем, — 101,2 працэнта. З'явілася амаль паўтысячы новых арганізацый у прамысловасці, створана больш за 7 тыс. рабочых месцаў. Аб'ём інвестыцый у асноўны капітал склаў $15 млрд (гэта 28 працэнтаў ад валавога ўнутранага прадукту)», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, атрымана дадатнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі ў суме $660 млн, што значна лепш за паказчык аналагічнага перыяду мінулага года.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што своечасова выконваюцца плацяжы па пагашэнні і абслугоўванні знешняга дзяржаўнага доўгу. Так, у бягучым годзе на гэтыя мэты накіравана $4,5 млрд.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што захоўваюцца бюджэтная дысцыпліна, своечасовае і поўнае выкананне абавязацельстваў бюджэту па выплаце зарплат, пенсій, іншых сацыяльных і першачарговых плацяжоў. «Даходы насельніцтва прыраслі амаль на Br60 трлн, прычым палову з іх людзі аднеслі і размясцілі ў нашых банках. Гэта сведчыць пра рост дабрабыту нашых грамадзян і іх давер да банкаўскай сістэмы», — сказаў Прэзідэнт.

«Добра, калі гэта так. Але хачу нагадаць усім прысутным, што ў свой час урад, Нацыянальны банк разам з мясцовымі органамі ўлады бралі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па выкананні шэрагу важнейшых параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Прычым самі ж сабе іх вызначалі. Дарэчы, не вельмі высокімі яны былі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што сітуацыю з невыкананнем гэтых абавязацельстваў летам разглядалі на спецыяльным пасяджэнні Савета бяспекі, дзе быў распрацаваны план канкрэтных дзеянняў да канца года. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што надышоў час разабрацца, наколькі эфектыўнымі аказаліся прынятыя ўрадам і Нацыянальным банкам захады, ці ўсё зроблена ў цэнтры і на месцах, каб вынікі адпавядалі намечанаму.

«ЗАСТАРЭЛЫЯ БАЛЯЧКІ»

«Ці ўсе рэзервы выкарыстаны? — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Лічу, не. Даклады, якія ляжаць у мяне на стале, паказваюць, што ў пасіве — многія застарэлыя балячкі і нявырашаныя праблемы».

У першую чаргу Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на існуючыя значныя запасы гатовай прадукцыі на складах прамысловых прадпрыемстваў. «Прычым яны не толькі вышэйшыя за вызначаны самім урадам нарматыў, але і за ўзровень далёка не самага паспяховага мінулага года. У чым справа? Я катэгарычна забараняў працаваць на склад! І не прымушаў вас гнаць аб'ёмы. Галоўнае — продажы і даходы ад гэтых продажаў!» — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

ЛІЧБА ДНЯ

Не менш як $6 млрд

разлічвае атрымаць наша краіна сёлета ад экспарту сельгаспрадукцыі. Пра гэта паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Седзін. Ужо ў 2015 годзе ставіцца задача па павелічэнні экспартнай выручкі да $7 млрд. Гаворачы, у прыватнасці, аб экспарце прадуктаў харчавання ў Расію, Васіль Седзін канстатаваў, што праца ідзе нармальна — па пастаўках як малака, так і мясных прадуктаў. «Мы больш за 55% прадукцыі пастаўляем у Расію, у апошні час крыху павялічылі пастаўкі сыроў», — сказаў намеснік міністра.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.11.2014 г.

Долар ЗША	10740,00	■
Еўра	13340,00	▼
Рас. руб.	234,00	▼
Укр. грыўня	723,23	▼

■ Парламенцкі дзённік

ПЕРШ ЗА ЎСЁ — ЗНЕШНІ ДОЎГ

Прафіцыт бюджэту стане падушкай бяспекі для эканомікі

У час сустрэчы дэпутатаў з прэм'ер-міністрам Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ абмяркоўвалася фарміраванне бюджэту на 2015 год. Зразумела, што закраналіся многія эканамічныя і сацыяльныя працэсы, якія адбываюцца ў краіне. Дэпутаты ўнеслі больш за дваццаць прапаноў па ўдасканаленні падатковага заканадаўства і адміністравання.

НЯПРОСТЫЯ ЎМОВЫ

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што развіццё краіны зараз праходзіць у вельмі складаных знешніх умовах. Гэта тычыцца рэзкага запаволення эканамічнага росту і серыі глыбокіх дэвальвацый нацыянальных валют асноўных гандлёвых партнёраў: Расіі (рубель дэвальваваў на 40% з пачатку года), Украіны (грыўна — на 70%), Казахстана (тэнге — на 20%). Прэм'ер-міністр таксама падкрэсліў, што зніжэнне экспарту склала з пачатку года ў Расію на 5,7%, ва Украіну — на 5,3%. Пры гэтым узраслі продажы на рынкі па-за СНД. Але падобныя абставіны не спрыяюць павялічэнню агульных аб'ёмаў гандлю. Многія фактары вельмі складана прадказаць, і праз гэта неабходна зрабіць эканамічную палітыку 2015 года больш гнуткай.

ІЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ ДЛЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Адной з асноўных інавацый у эканамічнай палітыцы наступнага года будзе ўвязаны па напрамках і крыніцах фінансавы план, які прадугледжвае льготны крэдыт на суму 22 трлн рублёў на падтрымку прамысловай вытворчасці і стымулявання экспарту. Для апошняга ў бюджэце закладзена 1,45 трлн рублёў. Таксама Банк развіцця Беларусі надзяляюць з 1 студзеня функцыямі каардынатара фінансавання ўсіх дзяржаўных праграм. У 2015 годзе будзе запушчаны новы механізм доступу па крэдытных лініях КНР, аператарамі якога стануць Банк развіцця і Беларусбанк, што забяспечыць прырост недарагой крэдытнай прапановы, падмацаваны валютай прыблізна на 10 трлн рублёў.

З УЛАСНЫХ КРЫНІЦ

Па словах Міхаіла Мясніковіча, выплаты па знешнім доўгу будуць ажыццяўляцца з уласных крыніц, а не з новых крэдытаў. У 2015 годзе ў бюджэце Беларусі прадугледжаны сродкі ў памеры 4 млрд доларaў. Атрыманыя рэсурсы ад нафтавага экспарту, у тым ліку мытныя пошліны, прапануецца накіраваць на зніжэнне дзяржаўнага доўгу.

«Такім чынам, прафіцыт бюджэту, які мы ўносім на разгляд, — гэта важная падушка бяспекі для рызык і выклікаў прагнознага перыяду. Я падрабязна на гэтым спыняюся, каб не было спакусы прафіцыт бюджэту накіроўваць на ўнутраныя эканамічныя і сацыяльныя праекты. Разлікі па знешніх пазыках павінны быць у прыярытэтным парадку», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

ЗАРПЛАТА АБГОНІЦЬ ІНФЛЯЦЫЮ

Для праектаў мадэрнізацыі запланавана каля 11 трлн рублёў на кампенсацыю працэнтных ставак па інвестыцыйных крэдытах. Аб'ём інвестыцый у эканоміку плануецца давесці да 240 трлн рублёў (27% ад ВУП). У бюджэце на 2015 год плануецца вылучыць больш сродкаў на будаўніцтва дарог і іх утрыманне. У гэты сектар збіраюцца накіраваць 11,2 трлн рублёў.

Плануецца павялічыць экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі на 13% да ўзроўню 2014 года. Экспартная выручка пры гэтым павінна скласці 7 млрд доларaў. Заработная плата работнікаў бюджэтнай сферы ў Беларусі ў 2015 годзе будзе расці хутчэй тэмпаў інфляцыі. Суадносіны сярэдняй заработнай платы бюджэтнікаў і агульнай па краіне крыху палепшацца — вырастуць да 75,1%.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

Дарэчы

Сярэднегадавы курс беларускага рубля ў 2015 годзе прагназуецца на ўзроўні 11300 — 11400 рублёў за 1 долар, паведаміла Надзея ЕРМАКОВА, старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі. А стаўка рэфінансавання на будучы год складзе 16-17% гадавых. Сёння яна складае 20% гадавых.

■ Год гасціннасці: шукаем ідэі

ДРАНІКІ Ў АЎТАРСКІМ ВЫКАНАННІ,

або Як смажаны сом можа падтрымаць туріндустрыю

Ці займаліся вы калі-небудзь кулінарным турызмам? Не спяшайцеся з адмоўным адказам, бо кожны, хто калі-небудзь выязджаў за межы краіны або нават проста ў іншую яе вобласць, міжволі становіцца кулінарным турыстам. Бо быць у Італіі і не пакаштаваць пасту, абысціся ў Іспаніі без паэллі, не паласавацца на гомельскім Палессі адмыслова смажаным сомам — значыць нібы і не пабыць там увогуле. Кулінарыя ўжо даўно і трывала стала часткай нацыянальных брэндаў, на якіх зарабляюцца немалыя грошы.

Мы толькі пачынаем ісці па гэтым шляху, набываючы ўласны досвед, памыляючыся і робячы поспехі. Цікавай практыкай у гэтым плане становіцца тыдзень беларускай кухні, які гэтымі днямі ўжо не першы раз праводзіцца ў беларускай сталіцы. Ідэя з'явілася і была ўвасоблена ў жыццё напярэдадні чэмпіянату свету па хакеі, яшчэ ў 2013 годзе. З таго часу дадатковыя беларускія стравы ў меню сталічных кавярняў і рэстарацый з'яўляюцца прыблізна раз на квартал.

Фота Надзеі БУКАН.

Сутнасць акцыі: у 85-ці кавярнях і рэстаранах гатуюць некалькі нацыянальных страў па аднолькавых рэцэптах і коштах. У гэтыя лістападаўскія дні можна пакаштаваць салату «Белавежская пушча» за Br45 тыс., грыбную поліўку за Br25 тыс., бужаніну з кіслай капустай і грыбамі за Br95 тыс., зразы курыныя па-віленску за Br65 тыс. і ягадны морс з вішань і журавін за Br15 тыс. Здавалася б, усё цікава і прывабна. Аднак думкі спецыялістаў адносна менавіта такога спосабу папулярызацыі нацыянальнай кухні вельмі разышліся.

СТАР. 4

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Блок Пятра Парашэнкі заняў найбольшую колькасць месцаў у Радзе

Цэнтральная выбарчая камісія Украіны падвяла афіцыйныя вынікі выбараў у Вярхоўную Раду. Найбольшую колькасць месцаў у парламенце, нягледзячы на перамогу «Народнага фронту» прэм'ер-міністра Арсенія Яцанюка, за кошт выбараў у аднамандатных акругах атрымлівае Блок Пятра Парашэнкі, паведамляюць інфармагенцтвы. Паводле пратакола ЦВК, у шматмандатнай агульнадзяржаўнай акрузе «Народны фронт» атрымаў 22,14% галасоў, Блок Пятра Парашэнкі — 21,81%, гэта значыць 64 і 63 дэпутацкія мандаты адпаведна. У той жа час з улікам вынікаў галасавання ў аднамандатных акругах Блок Пятра Парашэнкі атрымлівае ў Радзе 132 месцы, «Народны фронт» — 50, «Самадапамога» — 33, Апазіцыйны блок — 29, Радыкальная партыя — 22, «Бацькаўшчына» — 19.

У Індыі восем жанчын загінулі ў стэрылізацыйным лагеры

Яшчэ дзясяткі — у крытычным стане. Масавая стэрылізацыя, арганізаваная ў горадзе Біласпур у цэнтральнай Індыі, прывяла да гібелі жанчын. Усе яны сталі ўдзельніцамі бясплатнай праграмы па планаванні сям'і, у рамках якой праводзіцца добраахвотная стэрылізацыя. На думку сваякоў пацярпелых жанчын, аперацыі праводзіліся ў спешцы, што і прывяло да трагічнага зыходу.

Сур'ёзныя рашэнні лепш прымаць на галодны страўнік

Утрэхцкі ўніверсітэт высветліў, калі чалавеку лепш за ўсё прымаць рашэнні. Аказваецца, самыя правільныя думкі прыходзяць у момант голаду. А вось на сыты страўнік лепш рашэнні не прымаць, каб не дапусціць памылку. Гэта даказаў эксперымент з добраахвотнікамі. Людзей разбілі на дзве групы. Пры гэтым усім удзельнікам забаранялася да эксперыменту прымаць ежу. Далей адной групе добраахвотнікаў далі сняданак. Другая група працягвала галадаць. Пасля прайшлі тэсты. У выніку група галодных добраахвотнікаў выконвала пастаўленыя перад ёй задачы хутчэй і больш дакладна. А вось сытая дапускала больш памылак, даўжэй прымала рашэнні. Для чысціні эксперыменту тэст паўтарылі на наступны дзень, памяняўшы добраахвотнікаў месцамі. Вынік быў аналагічным.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Назарбаеў абвясціў аб новай эканамічнай палітыцы Казахстана



Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў абвясціў аб новай эканамічнай палітыцы Казахстана «Нурлы жол». «Жыццё ўносіць карэктывы ў нашы планы, і мы павінны дапоўніць платформу партыі новым зместам, зыходзячы з сённяшніх рэалій. Па маім даручэнні ўрад завяршыў распрацоўку новай маштабнай праграмы развіцця. Сёння, адказваючы на выклікі, якія стаяць перад намі, я абвяшчаю аб новай эканамічнай палітыцы Казахстана — «Нурлы жол», — сказаў Назарбаеў на пашыраным пасяджэнні палітрады партыі «Нур Атан». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што менавіта гэтаму пытанню прысвячае новае пасланне народу Казахстана. «Яно будзе мець контрцыклічны характар і будзе накіравана на працяг структурных рэформаў у нашай эканоміцы», — растлумачыў Назарбаеў. Прэзідэнт Казахстана таксама паведаміў, што з нацыянальнага фонду будзе дадаткова выдзелена да $3 млрд штогод для падтрымання эканомікі на 2015-2017 гады.

КАРОТКА

У 2015 годзе запланавана павелічэнне ў 1,9 раза аб'ёму будаўніцтва арэнднага жылля і ў 1,5 раза аб'ёму будаўніцтва жылля па дзяржзаказе.

Рыхтуецца да падпісання дакумент, які ўстановіць новы, больш доўгі тэрмін знаходжання нашых грамадзян на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы без пастаноўкі на міграцыйны ўлік — 90 дзён. Цяпер беларусы могуць знаходзіцца на тэрыторыі Расіі без пастаноўкі на ўлік 30 дзён.

Прафіцыт знешняга гандлю таварамі і паслугамі Беларусі за дзевяць месяцаў 2014 года склаў $871,6 млн. За аналагічны перыяд 2013 года сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі было адмоўным і перавышала $1 млрд.

Пасля завяршэння ў Дэйтона-Біч (ЗША) чэмпіянату свету па скачках на батуце і скачках на акрабатычнай дарожцы беларускія батутысты Уладзіслаў Ганчароў і Ганна Гарчанок, якія заваявалі на сусветным форуме бронзавыя ўзнагароды ў індывідуальных скачках, узняліся ў сусветным рэйтынгу на другія месцы.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

ПРА ГАЗЕТУ, БЕЛАРУСКУЮ МОВУ І САПРАЎДНАЕ МАСТАЦТВА

Сваімі думкамі на гэты конт падзялілася Зоя Самец з Клічава

— Колькі сябе памятаю, заўсёды чытала «Звязду», — з ходу прызнаецца Зоя Іванаўна. — А ў 1990-я гады, калі працавала старшынёй райсавета, нават пазнаёмілася з журналістамі газеты. Яны да нас прыязджалі, каб напісаць артыкул пра тое, як мы жывём. Потым яшчэ не раз сустракаліся на днях падпісчыка, а аднойчы яны завіталі, каб уручыць нашай Ларысе Дзенісевіч з Каўбчанскага сельсавета прыз: яна падпісалася на газету і выйграла тэлевізар.

У свой час вельмі дапамог былому старшыні райсавета дадатак «Мясцовае самакіраванне». «Для дэпутатаў гэта сапраўдны памочнік, — лічыць яна. — Там пра ўсё тое, што нас хвалюе. Мне і зараз цікава, як там вырашаюцца справы з тымі ж калодзежамі, з добраўпарадкаваннем. Сёння, напрыклад, праблема №1 — знос пустых дамоў. Як тут дзейнічаць, у каго павучыцца? А пагартаеш газету, пачытаеш, як іншыя праблемы вырашаюць, і зусім інакш глядзіш на справу. Яна ўжо не здаецца такой складанай, як спачатку».

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Час хуткіх і рашучых дзеянняў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сур'ёзную заклапочанасць у кіраўніка дзяржавы выклікае зніжэнне экспарту такіх найважнейшых тавараў, як аўтамабільная, сельскагаспадарчая і бытавая тэхніка, спажывецкія тавары. «У выніку ў знешнім гандлі недацягваем нават да леташніх паказчыкаў», — канстатаваў Прэзідэнт.

«Кожны год гаворым аб дыверсіфікацыі, а экспартныя патокі па-ранейшаму сканцэнтраваны на традыцыйных рынках, перш за ўсё Расіі, Украіны і Казахстана. Менавіта таму нават невялікія праблемы, якія ўзнікаюць на гэтых рынках, адразу выклікаюць цяжкасці і ў нас», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Сур'ёзнай праблемай з'яўляецца пагаршэнне фінансавага стану прадпрыемстваў. Колькасць стратных выросла больш як у паўтара раза (з 740 да 1200), а сумы чыстай страты — амаль у два разы: з Br5 трлн да Br9 трлн.

Акрамя таго, застаецца нездавальняльным стан з разлікамі. «Адкуль узяцца прыбытку і так званай «абаротцы», калі беларускія прамысловыя прадпрыемствы крэдытуюць сваіх замежных партнёраў! У іх знешняя дэбіторская запазычанасць перавышае знешнюю крэдыторскую. Апераджальнымі тэмпамі назапашваюцца пратэрмінаваныя даўгі нашым прадпрыемствам за пастаўленую прадукцыю. З пачатку года яны выраслі ў 1,7 раза да амаль $600 млн. Пытанне: калі грошы вернуцца ў краіну?» — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да прысутных.

Прэзідэнт звярнуў увагу таксама на марудныя тэмпы і невысокую эфектыўнасць мадэрнізацыі вытворчасці. Паводле яго слоў, пра гэта сведчаць шматлікія факты правалаў у дрэваапрацоўцы, лёгкай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і іншых галінах. «Пра гэта мы неаднаразова гаварылі, але значных зрухаў пакуль няма. Гэта вельмі сур'ёзны мінус у рабоце ўрада. Гэта, калі хочаце, стратэгічны пралік! Пытанне: калі пазбавімся ад такой дрэннай практыкі?» — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што чакае канкрэтных адказаў на гэтыя і іншыя праблемныя пытанні ад прэм'ер-міністра краіны. «Адразу заўважу, што апраўданні, спасылкі на неспрыяльныя знешнія фактары (як «капрызы надвор'я») не прымаюцца. Яны заўсёды былі і будуць. І, дарэчы, мы планавалі сваю працу сёлета, улічваючы гэтыя неспрыяльныя ўмовы. Нам трэба працаваць у любых умовах і дасягаць вынікаў, аператыўна рэагаваць на змяненні кан'юнктуры і прымаць рашэнні неадкладна. Вельмі хутка змяняецца свет, і мы не павінны несці страты ад непаваротлівасці і нерашучасці», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка чакае ад усіх прысутных, і перш за ўсё ад Камітэта дзяржкантролю, аб'ектыўнага аналізу таго, наколькі дзеянні ўрада і Нацыянальнага банка адпавядаюць сучасным патрабаванням.

ПА БАНКАЎСКІМ РАХУНКУ

Закранаючы пытанне даступнасці крэдытных рэсурсаў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Адкрыта скажу, вельмі шмат нараканняў ад кіраўнікоў прадпрыемстваў, бізнесменаў, простых людзей на непад'ёмна высокія працэнтныя стаўкі па крэдытах». Ён падкрэсліў, што ў сувязі з гэтым чакае адказу ад кіраўніка Нацбанка на пытанне аб даступнасці крэдытных рэсурсаў. «Калі гэта праблема будзе вырашана? Вядома, у гэтай сферы нельга нічога рабіць пагарачыўшыся, але і зацягваць працэс небяспечна. Лічу, што дзейнічаць трэба больш хутка і рашуча», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Прашу не забываць, што 2015 год завяршае бягучае пяцігоддзе. І нам з вамі на бліжэйшым Усебеларускім сходзе трэба будзе даць справаздачу перад народам за 5 гадоў, адкрыта сказаць грамадству, што абяцалі і што зрабілі», — адзначыў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, у сувязі з гэтым і патрабаванні да якасці прагнозу на 2015 год асаблівыя. Кіраўнік дзяржавы дадаў, што ключавыя ўмовы вызначаны. У наступны год Беларусь уваходзіць з узгодненым нафтавым балансам, прымальнымі ўмовамі па пастаўках нафты і газу. У выніку дамоўленасцяў па стварэнні ЕАЭС на $1,5 млрд павялічаны даходы бюджэту Беларусі ад пераліччэння вывазных мытных пошлін за нафтапрадукты. «Цікава, як гэтыя выгадныя ўмовы ўрад думае рэалізаваць. Ці вырашана канчаткова пытанне кампенсацыі страт ад так званага падатковага манеўру Расіі? На якія колькасныя і якасныя параметры развіцця можна разлічваць у 2015 годзе з улікам рэальна існуючай сітуацыі?» — спытаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да прэм'ер-міністра.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што неабходна мець дакладнае разуменне таго, як банкаўская сістэма будзе садзейнічаць вырашэнню задач, якія стаяць перад рэальным сектарам эканомікі.

Прэзідэнт адзначыў, што чакае ад тых, хто выступае, дакладнага адказу на пытанне, наколькі прапанаваныя праекты праграмных дакументаў на будучы год, з аднаго боку, рэальна дасягальныя, а з іншага — сапраўды напружаныя як для рэальнага сектара, так і для фінансавай сферы.

АД НАРОДА ТАЙНАЎ НЯМА

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ніколі не гуляў у тайны з народам як пры вырашэнні эканамічных праблем, так і пры прыняцці кадравых рашэнняў. «Ведаю, што напярэдадні гэтай нарады і ў сродках масавай інфармацыі, і ў нашым грамадстве, зразумела, кімсьці спецыяльна ўзнімаюцца асобныя пытанні, каб пачуць з маіх вуснаў адказы на іх. Некаторыя пытанні аб'ектыўна існуюць, тайнаў ніякіх няма. Я іх ніколі не рабіў, і мне няма неабходнасці гуляць у нейкія тайны з народам: ад вырашэння эканамічных праблем да кадравых», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што кадравае пытанне хвалюе ўсіх. «Я заўсёды загадзя ўсіх папярэджваў: усё будзе залежаць ад таго, як той ці іншы член урада, губернатар, памочнік напружваюцца, працуюць і якія вынікі даюць, — сказаў Прэзідэнт. — Будуць вынікі — будзе работа. Не будзе вынікаў — вы таксама ведаеце, што магчыма».

«Некаторыя ў нас міністры дапрацаваліся да таго, што іх дзеці пастаянна жывуць у Злучаных Штатах Амерыкі і навучаюцца там, а яны рэфармуюць нашу сістэму адукацыі. Зразумела, што будзе ад гэтых рэформаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

ТРЫ ВЫПРАБАВАННІ ДЛЯ ВЫБАРАЎ

Да 2016 года рэформаў у выбарчай сістэме Беларусі не чакаецца

Пра гэта ўчора паведаміла журналістам старшыня Цэнтрвыбаркама нашай краіны Лідзія Ярмошына. «Мы яшчэ не цалкам прымянілі тыя навацыі, якія былі прыняты год таму. Яны закранулі толькі мясцовыя выбары. Найбольш паказальнымі, я лічу, будуць нават не выбары прэзідэнта, а парламенцкія выбары ў 2016 годзе», — сказала яна.

Лідзія Ярмошына растлумачыла, што толькі па выніках парламенцкіх выбараў 2016 года Цэнтрвыбаркам выпрацуе нейкае меркаванне аб тым, ці будзе наша заканадаўства ў далейшым рэфармавацца або пакуль будзе ўдасканальвацца правапрымяняльная практыка.

Гутарка адбылася падчас работы міжнароднай канферэнцыі «Выбарчыя працэсы на прасторы СНД», якая праходзіць у гэтыя дні ў Мінску. Правядзенне такіх канферэнцый з'яўляецца традыцыйным. Гэтай практыцы каля дзесяці гадоў. Першапачаткова такія мерапрыемствы праводзіліся ў Санкт-Пецярбургу, а апошнім часам іх сталі арганізоўваць там, дзе ў бліжэйшы час чакаюцца важныя выбарчыя кампаніі.

Лідзія Ярмошына падкрэсліла таксама важнасць супрацоўніцтва з Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспечным супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ). «Мы можам крытыкаваць БДІПЧ АБСЕ, але гэта ўсё ж самая аўтарытэтная назіральная місія. Таму лічу, што з ёю трэба супрацоўнічаць. Любая, нават негатыўная ацэнка, але зробленая на падставе адкрытых падзей, лепш, чым наогул магільнае маўчанне. Не трэба АБСЕ, як і ўсе міжнародныя арганізацыі, лічыць закаснелымі ў поглядах чыноўнікамі, якія зусім не мяняюцца і не праводзяць гібкай палітыкі», — адзначыла Лідзія Ярмошына.

У сваю чаргу, прадстаўнік БДІПЧ АБСЕ Аляксей Громаў адзначыў, што такія форумы, як міжнародная канферэнцыя «Выбарчыя працэсы на прасторы СНД», даюць магчымасць зблізіць пазіцыі, абмеркаваць метадалогію назірання за выбарамі. Ён таксама нагадаў, што ўсе краіны СНД уваходзяць у АБСЕ. Акрамя таго, прадстаўнік БДІПЧ не выключыў, што маніторынгавая місія ад гэтай арганізацыі прыедзе назіраць за выбарамі Прэзідэнта Беларусі ў 2015 годзе.

Міжнародная канферэнцыя «Выбарчыя працэсы на прасторы СНД» арганізавана ў беларускай сталіцы сакратарыятам Савета МПА СНД, Выканкамам Садружнасці і Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. На яе запрошаны старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД Сяргей Лебедзеў, генеральны сакратар — кіраўнік сакратарыята Савета МПА СНД Аляксей Сяргееў, кіраўнікі і члены цэнтрвыбаркамаў Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Балгарыі, прадстаўнікі БДІПЧ АБСЕ, Асацыяцыі арганізатараў выбараў краін Еўропы, а таксама вядомыя палітыкі і грамадскія дзеячы краін Садружнасці.

На працягу двух дзён яны плануюць абмеркаваць пытанні, што датычацца развіцця выбарчага заканадаўства ў дзяржавах — удзельніцах СНД, практыкі міжнароднага назірання за выбарамі на прасторы Садружнасці, а таксама фарміравання агульнаеўрапейскага падыходу да міжнароднага электаральнага назірання ў цэлым.

Сёння, 12 лістапада, канферэнцыя працягне сваю работу ў Авальнай зале Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ У фармаце дыскусіі

Мары пра ідэальную дашкольную адукацыю, або Калі ўсе праблемы з дзіцячымі садкамі стануць часткай «успамінаў пра эпоху»?

Ці настане час, калі бацькам не прыйдзецца чакаць чаргі, каб аддаць сваё дзіця ў дзіцячы садок? Калі не трэба будзе дабірацца да таго садка ў іншы мікрараён? Чаго не хапае сучаснай школе? Пра ўсё гэта ішла гутарка падчас «круглага стала» на тэму «Стан і шляхі ўдасканалення заканадаўчага рэгулявання дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі», што праходзіў на базе 22-ой сталічнай гімназіі.

Мерапрыемства праводзілася ў рамках абмеркавання новага Кодэкса аб адукацыі. Арганізатарамі «круглага стала» выступіла Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, а таксама Міністэрства адукацыі нашай краіны.

— Мы бачым, як інтэнсіўна развіваецца і прамысловасць, і сельская гаспадарка, — адзначыў ва ўступным слове **Мікалай КАЗАРАВЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі**. — Натуральна, неабходны кадры, каб і надалей рэалізоўваць ідэі, якія ставіць дзяржава. Таму сістэма адукацыі адыгрывае важную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў. Адсюль і мэта нашага сённяшняга круглага стала — даведацца пра стан прававога забеспячэння дашкольнай і школьнай адукацыі і вызначыць, якія нарматыўныя акты, законы неабходны зараз, каб даць магчымасць ініцыятывае рэалізаваць сябе, каб талент змог прабіць сабе дарогу.

ДАРОГУ ПРЫВАТНЫМ САДКАМ

Васіль БУДКЕВІЧ, намеснік міністра адукацыі краіны ў сваім дакладзе заўважыў, што на працягу апошніх пяці гадоў паказчык развіцця сістэмы дашкольнай адукацыі па ахопе дзяцей з'яўляецца адным з самых высокіх сярод краін СНД. Так, у Беларусі працуе 4030 устаноў дашкольнай адукацыі, дзе выхоўваецца звыш чатырохсот тысяч дзяцей. Ахоп дзяцей ва ўзросце ад аднаго да шасці гадоў дзіцячымі садкамі па рэспубліцы складае прыкладна 75%. Па інфармацыі выступоўцы, забяспечаны 100-працэнтны ахоп дзяцей пяцігадовага ўзросту падрыхтоўкай да школы.

Як правіла, часцей за ўсё бацькі не вядуць дзіця ў садок, калі бачаць, што яно прыхварэла. І не заўсёды ёсць сэнс цягнуць яго адразу ў паліклініку. Часам дастаткова бывае пакінуць яго на дзень-два з бабуляй, а пасля ізноў можна прыводзіць у садок.

Для таго, каб дашкольная адукацыя была даступна для ўсіх малых, Міністэрствам адукацыі прымаюцца наступныя меры: будаўніцтва новых дзіцячых садкоў, арганізацыя падвозу дзяцей, адкрыццё груп кароткачасовага знаходжання, дадатковае стварэнне месцаў ва ўстановах дашкольнай адукацыі...

У той жа час сістэма дашкольнай адукацыі мае і свае праблемы.

— Амаль немагчыма запісаць дзіця ў садок, які знаходзіцца блізка ад дома, — канстатаваў дакладчык. — Сёння чарга ва ўстановы дашкольнай адукацыі краіны складае прыкладна 30 тысяч дзяцей.

Дзіцячыя садкі — як правіла, гарадскія — перапоўнены. Па інфармацыі, якую агучыў намеснік міністра адукацыі, звыш устаноўленых нарматываў укамплектавана 565 устаноў дашкольнай адукацыі. Пры гэтым перавышэнне напаўняльнасці груп складае ад 20% да 40%.

Зноў жа, вельмі шмат дзяцей з тых, што запісаны ва ўстановы дашкольнай адукацыі, без прычыны «прагульваюць». У той час як тысячы малых чакаюць сваёй чаргі, каб толькі запісацца ў садок. Як заўважыў Васіль Будкевіч, кардынальную меру, а значыць, выключэнне, да малых прагульшчыкаў не прымеш. Як правіла, часцей за ўсё бацькі не вядуць дзіця ў садок, калі бачаць, што яно прыхварэла. І не заўсёды ёсць сэнс цягнуць яго адразу ў паліклініку. Часам дастаткова бывае пакінуць яго на дзень-два з бабуляй, а пасля ізноў можна прыводзіць у садок. Па словах прадстаўніка міністэрства, неабходна разумець сітуацыю і не «чапляцца» да бацькоў: маці лепш ведае, калі дзіцяці лепш не ісці ў садок.

Перапоўнены дзіцячыя садкі і з-за наведвальнікаў-шасцігодак. Ім ужо ў школу трэба ісці, але бацькі вырашылі «падарыць» дзіцяці яшчэ год «бесклапотнага жыцця».

Рашэнне такіх праблем Міністэрства адукацыі бачыць у адкрыцці новых дзіцячых садкоў, асабліва ў раёнах-новабудоўлях. Сваю станоўчую ролю павінна адыграць і развіццё сеткі прыватных дашкольных устаноў, а таксама адкрыццё ў дзяржаўных установах дашкольнай адукацыі груп на платнай аснове — так званых гаспадарча-разліковых груп.

КОНКУРСЫ ДЛЯ АЎТАРАЎ ПАДРУЧНІКАЎ

Гаворачы пра агульную сярэднюю адукацыю, Васіль Будкевіч звярнуў асаблівую ўвагу на павышэнне якасці школьнай адукацыі. Ён падкрэсліў важнасць ведання ў сённяшніх рэаліях замежнай мовы.

— Намі праведзена ўся неабходная праца па ўвядзенні з 2012-2013 навучальнага года абавязковага вуснага экзамену па замежнай мове, — паведаміў Васіль Будкевіч.

Ён звярнуў увагу і на тое, што, як паказвае практыка, сучасныя дзеці ў сваёй большасці адчуваюць недахоп у рухальнай актыўнасці.

У мэтах прапаганды здаровага ладу жыцця, зняцця эмацыянальнай нагрузкі на працягу навучальнага года ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі забяспечана правядзенне трох заняткаў у тыдзень па прадмеце «фізічная культура і здароўе».

— У выніку зніжаецца сіла, працаздольнасць, дзеці пакутуюць ад парушэння паставы, скрыўлення пазваночніка, затрымкі ўзроставага развіцця. У мэтах прапаганды здаровага ладу жыцця, зняцця эмацыянальнай нагрузкі на працягу навучальнага года ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі забяспечана правядзенне трох заняткаў у тыдзень па прадмеце «фізічная культура і здароўе».

Гаворачы пра падручнікі, Васіль Будкевіч падкрэсліў, што ў краіне створана нацыянальная сістэма вучэбнага кнігавыдання.

— Што б ні казалі, хачу адзначыць, што ўсе навучальныя ўстановы забяспечаны падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі. У мэтах якаснай падрыхтоўкі падручнікаў з 2008 года праводзіцца адпаведны конкурс. Да ўдзелу ў падрыхтоўцы падручнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі прыцягваюцца пераможцы і лаўрэаты рэспубліканскіх конкурсаў нацыянальнага майстэрства, педагагічныя работнікі, вядомыя настаўнікі-практыкі.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

НАКЛЕЙКА НА ШКЛЕ — НЕ ПРОСТА ЎПРЫГАЖЭННЕ

З 11 па 20 лістапада ў краіне будзе праходзіць рэспубліканская дэкада «Дзяржтэхагляд».

Асноўная мэта акцыі — узмацненне кантролю за своечасовым праходжаннем дзяржтэхнагляду транспартных сродкаў і прыцягненнем увагі аўтаўладальнікаў да пытання падтрымання аўтамабіляў у тэхнічна спраўным стане. Групы, у склад якіх увойдуць прадстаўнікі ДАІ, Транспартнай інспекцыі і УП «Белтэхагляд», будуць у першую чаргу звяртаць увагу на аўтамабілі, якія эксплуатуюцца без дазвольнай наклейкі на лабавым шкле. У сувязі з падпісаннем Указа № 483, якім унесены змены ў ПДД, і набліжэннем зімовага перыяду, асаблівая ўвага будзе надавацца стану шын аўтатранспарту. Аўтаўладальнікам, якія выкарыстоўваюць летнюю гуму, будуць настойліва рэкамендаваць замяніць шыны на адпаведныя сезону.

Да асоб, якія эксплуатуюць транспартныя сродкі без своечасова пройдзенага дзяржтэхнагляду, будуць прымяняцца штрафныя санкцыі, памер якіх сёлета павялічаны і складае ад адной да трох базавых велічынь пры першым цягам года парушэнні і ад трох да пяці — пры паўторным.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БІБЛІЯТЭКА ЗНЯЛА ФІЛЬМ

Ролік з 30-хвілінным запісам знаёміць з сакрэтамі рамеснікаў і народных умельцаў Магілёўшчыны. Гэта яшчэ адзін праект Магілёўскай абласной бібліятэкі імя Леніна, прысвечаны сёлетняму Году гасціннасці.

— Да жанру кіно мы звярнуліся ўпершыню, — падзялілася **загадчыца аддзела беларускай літаратуры і краязнаўства Тамара КАЛІНІНА**. — Друкаванага матэрыялу аб тым, якія таленавітыя людзі жывуць у нашым краі, хапае, але адна справа — пачытаць і зусім іншая — убачыць. У тым, як з-пад рук майстра з'яўляюцца цудоўныя рэчы, прысутнічае нейкая магія. Ініцыятарам і тэхнічным выканаўцам гэтай задумкі стала наша бібліятэкар Вольга Сярнова. Інфармацыйную падтрымку аказаў абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы. У патэнцыйных турыстаў цяпер ёсць добрая магчымасць азнаёміцца з творчым патэнцыялам Прыдняпроўскага краю. Усяго тут прадстаўлена 18 майстроў, якія дэманструюць свае веды ў галіне ганчарства, саломапляцення, бондарства, выцінанкі, вышыўкі і іншых народных промыслаў.

Набыць відэафільм «Магілёўскія гасцінцы» можна непасрэдна ў бібліятэцы. Яго кошт — 50 тысяч рублёў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

А ТЫ ЯШЧЭ НЕ СТУДЭНТ?

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, амаль кожны пяты малады чалавек у Беларусі — студэнт. Дарэчы, у студэнцкім асяроддзі колькасць прадстаўніц прыгожага полу пераважае: на 10 юнакоў прыпадае 14 дзяўчат.

На пачатак 2013/2014 навучальнага года ў 54-х ВНУ краіны навучаліся 395,3 тысячы студэнтаў і 7,6 тысячы магістрантаў, сярод іх 13,9 тысячы замежных грамадзян.

Трэцяя частка ўсіх студэнтаў навучаецца бясплатна. У дзяржаўных ВНУ за кошт бюджэтных сродкаў атрымліваюць адукацыю 57% студэнтаў дзённай формы навучання. Каля паловы ад агульнай колькасці беларускіх студэнтаў атрымліваюць вышэйшую адукацыю на завочнай форме навучання.

Па колькасці студэнтаў у разліку на 10 тысяч насельніцтва Беларусь мела ў 2013/2014 навучальным годзе самы высокі паказчык сярод краін СНД — 417 студэнтаў. Для параўнання, у Расіі гэты паказчык складае 394, Кыргызстане — 391, Украіне — 380 студэнтаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

УДАРЫЛА ТОКАМ НА СТАНЦЫІ

Позна ўвечары ў Дзяржынскім раёне 14-гадовы падлетак атрымаў удар токам. Адбылося гэта на чыгуначнай станцыі «Фаніпаль».

— Білетны касір паведаміла пра загаранне чыгуначнага вагона на станцыі, але пажарныя-выратавальнікі, прыбыўшы, ніякага пажару не выявілі. Затое знайшлі на даху чыгуначнага вагона чалавека, які падаваў прыкметы жыцця. Пасля адключэння чыгуначнікамі напружання кантактнай лініі пацярпелага знялі з вышыні і перадалі медыкам, — даведаліся мы падрабязнасці здарэння ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Ім аказаўся вучань 9 класа, хлопчык 2000 года нараджэння, які атрымаў тэрмічныя апёкі першай-другой ступеняў чвэрці паверхні цела. Высветлілася, што падлеткі праводзілі дадому таварышаў, якія накіроўваліся ў сталіцу. Пасля адпраўлення электрычкі вырашылі затрымацца на чыгуначнай станцыі і крыху пасваволіць. Адзін з хлопчыкаў ускараскаўся на цыстэрну, дзе і атрымаў удар токам.

АЎТАВАНДАЛ ПАШКОДЗІЎ 13 АЎТО

Ранкам жыхар аднаго з дамоў па вуліцы Каліноўскага ў сталіцы ўбачыў, што кола яго аўтамабіля пашкоджанае.

— А крыху пазней высветлілася, што такі ж лёс напаткаў яшчэ 12 машын, прыпаркаваных у двары. Пашкоджанні былі ў выглядзе бакавых праколаў і парэзаў пакрышак. Агульная сума шкоды пацярпелым перавысіла 12 мільёнаў рублёў, — распавяла прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Святлана Білінская. — На месцы здарэння нашы супрацоўнікі знайшлі мабільны тэлефон, які, магчыма, належаў аўтавандалу. Пры затрыманні ў маладога чалавека быў знойдзены нож. Дзеянням затрыманага даецца прававая ацэнка, прызначаны шэраг экспертыз. Правяраецца яго датычнасць да аналагічных злачынстваў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Подыум

Беларускі тыдзень моды: творчасць, натхненне і прыгажосць

Натоўп гасцей імкнецца хутчэй заняць месцы сярод гледачоў, за сцэнай ідзе апошняя падрыхтоўка да выхаду на подыум, арганізатары і валанцёры замерлі ў чаканні, на пляцоўцы НВЦ «Белэкспа» — хваляванне і прадчуванне ўсеагульнай эстэтычнай асалоды... На календары — лістапад, а значыць, першыя паказы дызайнерскіх калекцый Беларускага тыдня моды (вясна-лета 2015) пачаліся!

Сёлета газета «Звязда» будзе ажыццяўляць інфармацыйную падтрымку дзявятай, самай буйной падзеі моды ў Беларусі (www.bfw.by), таму ў наведвальнікаў нашага сайта з'явіцца выдатная магчымасць атрымліваць самыя апошнія навіны праекта на роднай мове. Больш прыемна, што тэматыка Беларускага тыдня моды (БТМ) праходзіць пад лозунгам «I love BFW. I love Belarus!» ("Я люблю БТМ. Я люблю Беларусь!"). Аргкамітэт праекта ўпэўнены, што любоў да сваёй Радзімы сёння з'яўляецца вельмі актуальнай тэмай сярод маладога, сацыяльна актыўнага насельніцтва Беларусі, а падтрымка такога значнага аспекту — адна з найважнейшых задач буйных міжнародных мерапрыемстваў. Але пра ўсё па парадку.

Чым здзівіць Беларускі тыдзень моды на гэты раз? Прафесіяналы моды, міжнародныя эксперты, калегі з Берліна, Мілана, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Астаны і Варшавы прыедуць у Мінск, каб наведаць паказы. Таксама ў праграме Belarus Fashion Week пройдуць паказы замежных дызайнераў: TINATIN MAGALASHVILI (Грузія), Olya (ААЭ, Дубаі), Coo Culte (Латвія), Kevork Shadoyan (Арменія). Адзначым, што ўжо не першы сезон праект падтрымліваецца Міністэрствам замежных спраў, што дапамагло запусціць праграму па культурным абмене (Design Support Program by Embassy). Пры падтрымцы пасольстваў пройдуць прэзентацыі брэндаў Ivan Man (Германія) і GRINKO (Італія).

Сёння ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адкрыецца новая выстава, прысвечаная нацыянальнаму касцюму і яго варыяцыям у сучасным адзенні. Гэта будзе нетрадыцыйная экспазіцыя: арганізатары выставы прапануюць наведвальнікам параўнаць, як беларускія матывы адбіваліся ў вопратцы мінулага і як яны «жывуць» цяпер.

Экспанаты для «традыцыйнай» часткі прапанавала прадпрыемства «Скарбніца»: у запасах яго знаходзяцца ўнікальныя ўзоры адзення, адноўленыя ў адпаведнасці з традыцыямі кожнага рэгіёна. «Сучасная» частка экспазіцыі будзе прадстаўлена адзеннем і аксесуарамі ад маладых беларускіх брэндаў, якія за аснову сваёй творчасці бяруць элементы гісторыі і культуры Беларусі.

Беларуская мода ёсць! Яна выбіральная, яркая, унікальная і непаўторная, мае свой характар. Доказ гэтаму — штогадовы конкурс маладых дызайнераў New Names БТМ, які дае ўнікальную магчымасць гучна заявіць пра сябе і прыадчыняе тыя самыя «запаветныя дзверы» ў закуліссе беларускай fashion-індустрыі. Конкурс — гэта сапраўднае адкрыццё творчасці, дызайнерскай думкі, панаванне густу і натхнення.

Бліжэй пазнаёміцца з творчасцю вядомых беларускіх дызайнераў, а таксама ацаніць працу пачаткоўцаў, якія толькі пачынаюць заваёўваць месца на модным небасхіле, можна будзе практычна адразу пасля паказу. Спецыяльна для гэтага на пляцоўцы БТМ будзе працаваць SHOWROOM — адкрытая выстава-прэзентацыя дызайнерскага адзення, абутку і аксесуараў.

Чакаем Вас на старонках «Звязды» і модных паказах Беларускага тыдня моды!

Алеся ВАРАБ'ЁВА

■

■ Шэры бізнес

ІЛЖЭПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ЗАРАБЛЯЛІ НА... ВАЛЮЦЕ

Толькі за 5 месяцаў яны набылі ў абменніках 1,2 млн долараў

У ходзе праведзенай сумеснай праверкі і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі АБЭЗ Кастрычніцкага РУУС Мінска і пракуратуры раёна ўстанавілі, што толькі за 5 месяцаў ілжэпрадпрымальніцкай дзейнасці двое мінчан купілі ў банках 1,2 млн долараў, паведаміла **старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах ГУБЭЗ МУС Беларусі Вераніка ПАСМЕЦЬЕВА**.

Як высветлілі сталічныя аператыўнікі службы БЭЗ, раней судзімыя і нарказалежныя браты былі зарэгістраваны ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў з заяўленым відам дзейнасці «аптовы гандаль будаўнічымі матэрыяламі». Аднак ніякай гаспадарчай дзейнасці па рэалізацыі будматэрыялаў яны не ажыццяўлялі, а займаліся забароненай дзейнасцю, звязанай з атрыманнем наяўных грашовых сродкаў у беларускіх рублях і наступнай іх канвертацыяй у долары. Менавіта такія паслугі яны аказвалі іншым суб'ектам гаспадарання.

З кастрычніка 2012 года па люты наступнага года падазраваныя заключалі фіктыўныя дагаворы куплі-продажы з трэцімі асобамі («заказчыкамі»), пасля чаго здымалі з рахункаў беларускія рублі і абменьвалі іх на замежную валюту. Потым ужо долары перадавалі сваім «заказчыкам». За адзін раз браты маглі абмяняць у банку 15-20 тысяч долараў, а за адзін тыдзень праводзілі 2-3 такія абменныя аперацыі. За аказаную разавую паслугу яны атрымлівалі па 200-300 тысяч рублёў. Такім чынам, толькі за 5 месяцаў падазраваныя набылі ў банках каля 1,2 млн долараў, чым прычынілі шкоду дзяржаве ў выглядзе нявыплаты падаткаў у памеры 3,4 млрд рублёў.

Цяпер пракуратурай Кастрычніцкага раёна сталіцы па матэрыялах АБЭЗ у дачыненні да іх распачата крымінальная справа за лжэпрадпрымальніцтва, што пацягнула прычыненне шкоды ў асабліва буйным памеры. Паводле крымінальнага заканадаўства, за здзяйсненне названага злачынства можа быць прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Сяргей КУРКАЧ

■

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання ФРАЛОВА Валерыя Дзмітрыевіча і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

БЕЛАРУСБАНК

Вниманию держателей карточек ОАО «АСБ Беларусбанк»!

С 12 ноября 2014 года изменяются размеры некоторых вознаграждений по операциям с использованием банковских платежных карточек ОАО «АСБ Беларусбанк»:

Наименование операции	Размер вознаграждения
Срочное оформление (перевыпуск, обновление, изготовление дубликата) карточек БЕЛКАРТ, БЕЛКАРТ-ПРЕМИУМ, БЕЛКАРТ «Сберегательная», БЕЛКАРТ «Аграрная», Visa Electron (со специальным дизайном для пенсионеров), БЕЛКАРТ «Студенческая». Услуга предоставляется клиентам учреждений банка, расположенных в г. Минске.	130 000 бел. руб.
Перевыпуск карточек с индивидуальным дизайном БЕЛКАРТ «ФотоКарта», БЕЛКАРТ «Детская» в случае их утери (хищения), изготовление дубликата вышеуказанных карточек.	75 000 бел. руб.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛ №№ 0576052, 0637208, серии БЛБ № 0674825 **считать недействительными.** *УНП 100122726*

25 ноября 2014 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элегант».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 19.11.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНН 400078331

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

12 лістапада 2014 г. № 17 (338)

ТЭМА ТЫДНЯ

КАНТАКТЫ І КАНТРАКТЫ

Дэпутаты Саветаў пярвічнага ўзроўню таксама павінны фарміраваць аб'ектыўны погляд на Беларусь

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Святлана Герасімовіч сустрэлася са старшынямі пасялковых і сельскіх Саветаў у Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Дададзім, што такія мерапрыемствы ўжо сталі традыцыйнымі. На гэты раз Святлана Герасімовіч праінфармавала ўдзельнікаў сустрэчы аб рабоце Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

Ёсць прапанова — уносьце!

Выязныя пасяджэнні гэтай структуры непасрэдна ў рэгіёны, арганізацыі, на прадпрыемствы даюць магчымасць вывучыць і прааналізаваць праблемы. У выніку выпрацоўваюцца канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні дзейнага заканадаўства ў галіне мясцовага самакіравання, якія накіроўваюцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта, Савет Міністраў, міністэрствы і ведамствы. І трэба сказаць, такая праца прыносіць свае вынікі. Напрыклад, пэўным крокам да самастойнасці сельсаветаў стала магчымасць распараджацца грашыма ад продажу зямельных участкаў на аўкцыёнах і ад іх арэнды. Гэтыя сродкі ідуць на падтрыманне ў належным стане населеных пунктаў, добраўпарадкаванне тэрыторый, рамонт вулічнага асвятлення і дарожнай сеткі. Добры набытак — узаконены для дэпутатаў адзін вольны ад асноўнай работы дзень у месяц з захаваннем сярэдняй зарплаты, які яны могуць прысвяціць працы непасрэдна з выбаршчыкамі ў акругах.

— Вы таксама маеце магчымасць уносіць свае прапановы ў Савет па ўзаемадзеянні. Але хочацца, каб праблема была дакладна агучана, выверана, канкрэтна сфармулявана. Разам з тым ёсць шмат пытанняў, якія, акрамя вас, ніхто не вырашыць, — звярнулася да прысутных Святлана Міхайлаўна. — Вы людзі дзяржаўныя, вас ведаюць на месцах, ацэньваюць па вашых дзеяннях і ўчынках, з вас бяруць прыклад. Менавіта вы, як ніхто іншы, блізкія да людзей. Дэпутат павінен часцей сустракацца са сваімі выбаршчыкамі. А ў такія ключавыя моманты гісторыі, як цяпер, з улікам падзей ва Украіне, санкцый заходніх краін у дачыненні да Беларусі, выбараў прэзідэнта, якія наперадзе, — асабліва. Трэба выкарыстоўваць кожную магчымасць, каб даносіць людзям праўдзівую інфармацыю.

У прыватнасці, дэпутатам Саветаў пярвічнага ўзроўню даводзіцца мець справу з тымі ж дармаедамі. Гэтыя людзі карыстаюцца ўсімі льготамі, бясплатнай медыцынай, адукацыяй, а падаткаў не плацяць. Разам з тым патрабуюць пенсію, ды не абы-якую. «Гэта таксама сур'ёзная тэма для працы», — канстатавала Святлана Герасімовіч.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Утульны «ірландскі дом»

ПА СРОДКАХ

ЭКАНОМІЦЬ НА ЎСІМ, АКРАМЯ ЯКАСЦІ

Дэпутаты Магілёўшчыны вывучалі на месцах, колькі каштуе сацыяльны стандарт

Нэлі ЗІГУЛЯ

Кожны з нас можа разлічваць на той мінімум матэрыяльных даброт і паслуг, якія дзяржава прадстаўляе ў розных сферах жыцця. Але час ідзе хутчэй, чым мяняюцца нарматывы. Асабліва гэты дысананс адчуваецца ў вясковай мясцовасці, дзе колькасць жыхароў год ад года змяншаецца, а значыць, прыходзіцца закрываць школы, паштовыя аддзяленні, іншыя сацыяльныя аб'екты. Утрымліваць іх за кошт дзяржавы становіцца ўсё складаней. Як сэканоміць бюджэтныя сродкі і ў той жа час не пакрыўдзіць спажыўца? Адказ на гэтае пытанне дэпутаты шукалі падчас наведвання Глускага раёна.

Ад стацыянарных да перасовачных

Сёння ў раёне пражывае 14,7 тысячы чалавек, і штогод вясковых жыхароў становіцца на 340–360 чалавек менш. Нехта памірае, нехта мяняе прапіску. Але сацыяльныя стандарты застаюцца ранейшымі. Аб тым, як яны выконваюцца, можна даведацца з афіцыйнага сайта райвыканкама. Але адна справа — лічбы, і зусім іншая — убачыць усё на свае вочы.

Уразіў раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, будынак якога ўзведзены з дапамогай дабрачыннай ірландскай арганізацыі. У адным памяшканні — аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў і пажылых грамадзян і цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. Тут сапраўды ўтульна і прыгожа: новая мэбля, сучаснае абсталяванне, камп'ютарны клас. У аддзяленні працуе 5 гурткоў і майстэрня па вырабе буклетаў, календароў, нататнікаў. Імкненне зарабляць самім заслугоўвае толькі павагі, бо ўтрыманне аднаго чалавека ў такой установе — задавальненне не з танных.

Глуск — горад невялікі, але гісторыка-краязнаўчы музей і Дом культуры працуюць без страт. Ад дадатковых сродкаў тут не адмовіліся б, але ўжо тое, што атрымліваецца ўкладвацца ў бюджэтныя нарматывы, пахвальна.

На перыферыі ў мэтах эканоміі больш распаўсюджаны «перасовачныя» паслугі. У аграгарадку Катка дэпутаты паглядзелі, як працуе аўталаўка. Крам тут хапае, але калі аўталаўка прыязджае на аддаленыя вуліцы, жыхары толькі «за». Старшыня райпа Сяргей Зубчонак запэўніў, што ўвесь неабходны тавар — у наяўнасці, а для індывідуальных заявак існуе спецыяльная кніга. На амаль дзве тысячы вясковага насельніцтва працуюць 5 аўталавак. Нядаўна была набыта шостая — на той выпадак, калі адна з машын выйдзе са строю. А летам, калі насельніцтва прырастае за кошт гараджан, можна будзе зрабіць яшчэ адзін дадатковы маршрут.

— Калі ў аддаленых вёсках закрываліся стацыянарныя крамы, было шмат скаргаў, — прызнаўся старшыня райпа. — Але хутка людзі зразумелі, што так нават зручней. Машына пад'язджае амаль да кожнага дома. А зімой нашы гандляркі і ў хату тавар занясуць, а калі трэба, яшчэ і вады прынясуць з калонкі.

Не абышла раён бокам «аптымізацыя» паштовых аддзяленняў. Сёлета тут закрыты 4 з іх. Засталося 16, адно — перасовачнае.

— За кошт таго, што закрылі стратныя аддзяленні сувязі, атрымалі прыбытак, — паведаміў начальнік Глускага вузла паштовай сувязі Аляксандр Калента. — За 9 месяцаў зарабілі 140 мільёнаў рублёў.

Па словах кіраўніка, насельніцтва з паразуменнем ставіцца да такога вырашэння праблемы. Спачатку, праўда, былі незадаволеныя. Вядомая справа: пошта — сацыяльны аб'ект, дзе людзі прывыклі не толькі за паслугі плаціць, але і нейкія навіны абмяркоўваць. Затое зараз паштальён пенсіі адразу на дом прыносіць, а заадно бярэ грошы за паслугі і нават прымае заказы на пэўны тавар.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Выхаванцы цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

Фота Нэлі ЗІГУЛІ.

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

ДЫМУ БЕЗ АГНЮ НЕ БЫВАЕ

«Пасля таго, як рэдакцыя зацікавілася працай камунальнай гаспадаркі г. Лагойска (зварот жыхароў вуліцы Падгорная, в. Лагаза), тут былі адрамантаваны калонкі і водаправод, і нейкі час усё было добра. Праўда, гэта цягнулася нядоўга, а затым вада перастала падымацца ўгору. Спачатку палічылі, што ёсць парыў на водаправодзе. Шукалі яго, але не знайшлі. Стала зразумела, што ваду з водаправода проста крадуць, і ў значных памерах: каля 5 кубаметраў за суткі. Камунальнікі ж налічваюць аплату за ваду, якая не даходзіць да людзей. Атрымліваецца, што нейкі злодзей абкрадае жыхароў вуліцы і дзяржаву…» — такі ліст даслаў нам Уладзімір Гваздзецкі.

Як адзначае чытач, у 2010 годзе на вуліцы Падгорнай набыў невялікую хату Алег Сафроненка: з-пад Плешчаніц прывезлі стары трухлявы зруб, да яго дадалі новы брус і зрабілі дом. Дом будаваўся на ўчастку ў 25 сотак. А цяпер уладальнік абгарадзіў тэрыторыю плошчай каля 40 сотак. «Сёлета сюды завезлі матэрыялы і пабудавалі навесы і выпас, куды змяшчаюць гусей, качак і курэй. Агульная колькасць маладняку птушкі для дагадоўвання — больш як 2 тысячы. Пры нормах 2 літры вады на адну асобіну за суткі атрымліваецца, што яе для спажывання на ферме патрэбна каля 5 кубаметраў. Але самае галоўнае, што ўсё гэта адбываецца ў водаахоўнай зоне. Санітарна-ахоўныя зоны для птушкафермаў прадугледжаны не менш як за 300 метраў да бліжэйшага жылога дома населенага пункта. І гэта пры ўмове, што будзе вытрымлівацца тэхналогія гадоўлі птушак — у памяшканнях і на выпасах: цвёрдае пакрыццё, рэгулярнае прыбіранне адходаў і іх складзіраванне на пэўнай адлегласці, усталяваны дэзбар'еры, каб хваробы не перадаліся людзям і іх свойскай жывёле і многае іншае, чаго няма. Улічваецца і напрамак ветру, каб смурод не даходзіў да людзей», — канстатуе Уладзімір Гваздзецкі.

«Прадстаўнікі камунальнай службы некалькі разоў прыязджалі і шукалі парыў на водаправодзе, але як ты яго знойдзеш, калі яго няма. Проста работнікі Сафроненкі ставяць каля дома ёмістасці і напаўняюць іх вадой з водаправода. Потым гэтую ваду перапампоўваюць на сваю ферму. Урэзку ў водаправод зрабілі самастойна, без усталявання спецыяльнага калодзежа», — сцвярджае заяўнік. Акрамя таго, ён скардзіцца, што верхняя частка вуліцы Падгорная зарастае баршчэўнікам.

У Гайненскім сельвыканкаме Лагойскага раёна «Мясцоваму самакіраванню» паведамілі, што для разгляду пытанняў, якія закранае ў сваім лісце Уладзімір Гваздзецкі, створана камісія. Факты, выкладзеныя ў звароце, сапраўды маюць месца: грамадзянін Сафроненка самавольна захапіў зямельны ўчастак у памеры 0,15 гектара. У выніку землеўпарадкавальнай службай райвыканкама на яго складзены адміністрацыйны пратакол. У дачыненні да незаконнай гадоўлі птушак у колькасці 2300 галоў і парушэння санітарна-гігіенічных правілаў сельвыканкам накіраваў зварот у санэпідэмстанцыю для разгляду.

Што датычыцца баршчэўніка Сасноўскага, то сёння ён расце амаль на 89 гектарах зямель раёна, у тым ліку значная колькасць яго распаўсюджана менавіта на тэрыторыі Гайненскага сельсавета. У 2014 годзе для скарачэння «пасеваў» менавіта тут праведзены наступныя работы: пераарана каля 25 гектараў зямлі, выкашаны 31 гектар плошчы, пры дапамозе хімічных сродкаў знішчана каля 7,2 гектара, занятых баршчэўнікам. Лагойскай раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя неаднаразова накіроўваліся рэкамендацыі Гайненскаму сельвыканкаму аб выкараненні гэтай шкоднай расліны, усе яны своечасова выконваліся. На гэты раз таксама выдадзена прадпісанне па правядзенні работ па знішчэнні баршчэўніка непасрэдна на вуліцы Падгорнай.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

УЛАСНАЕ І ДЗЯРЖАЎНАЕ

«НЕМАЛЕНЬКІ» БІЗНЕС

Прыватнікам на вёсцы дапамогуць прэферэнцыі

Ірына АСТАШКЕВІЧ

На тэрыторыі Гомельскай вобласці толькі за апошнія дзевяць месяцаў было зарэгістравана 825 новых прадпрыемстваў. Прычым чвэрць з іх знаходзіцца менавіта ў сельскай мясцовасці і ў малых гарадах.

Безумоўна, на ўсплёск актыўнасці, асабліва леташні, паўплываў прыняты Дэкрэт Прэзідэнта № 6 «Пра стымуляванне прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці». Згодна з ім, прадпрымальнікі з большасці раёнаў (акрамя гарадоў Гомель, Мазыр, Светлагорск, Рэчыца і Жлобін) актыўна карыстаюцца прэферэнцыямі, прадугледжанымі ў дзяржаўным дакументе. На пачатак года дэкрэтам скарысталіся 340 суб'ектаў гаспадарання.

— Гэта розныя, дастаткова істотныя падатковыя льготы, — тлумачыць **Марына КРЫВУНЬ, начальнік аддзела прадпрымальніцтва камітэта эканомікі Гомельскага аблвыканкама.** — Летась было зарэгістравана больш прадпрыемстваў, але сёлета нас радуе тое, што, нягледзячы на адмены льгот па ўвозе аўтатранспарту, 202 прадпрыемствы былі зарэгістраваны ў сельскай мясцовасці. Найбольш актыўна з патэнцыяльнымі прадпрымальнікамі працуюць у Гомельскім раёне, і гэта зразумела — ён знаходзіцца блізка ад абласнога цэнтра, што вельмі прывабна для развіцця бізнесу. Вельмі актыўна развіваецца прадпрымальніцтва ў Жлобінскім раёне. Там сёння восем прадпрыемстваў працуюць на вытворчасць прамысловай прадукцыі. Пры гэтым у кожным дастаткова вялікая колькасць супрацоўнікаў. Сёлета ў Калінкавіцкім раёне было зарэгістравана прадпрыемства «МегаЛес» па перапрацоўцы драўніны. На ім заняты ўжо 41 чалавек. У Рэчыцкім раёне вельмі актыўна ўцягваецца ў абарот маёмасць, якая не выкарыстоўвалася, і на яе базе ствараюцца новыя прадпрыемствы. Новыя прадпрыемствы таксама створаны ў Ельскім і Жыткавіцкім раёнах.

Між іншым, удзельная вага паступленняў у бюджэт ад суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу ў Нараўлянскім раёне складае 47%, у Чачэрскім — 46,8%. Калі браць сярэднюю лічбу па вобласці, то 18,5% сродкаў у бюджэт забяспечваюць прадпрымальнікі. І таму задача ўлады — стварыць максімальна камфортныя ўмовы для развіцця бізнесу, падкрэслівае Марына Крывунь.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

ЛЮДЗІ СВАБОДНЫХ НОРАВАЎ,

або Санта-Барбара мясцовага «разліву»

Святлана ЯСКЕВІЧ

Цяпер такіх грамадзян можна сустрэць ледзь не ў кожным населеным пункце, і ніхто дакладна не ведае, як змагацца з гэтай грамадскай заганай. У адной з вёсак Мілавідскага сельсавета Баранавіцкага раёна жыве 44-гадовы мужчына. Ён не працаваў ніводнага дня, нават працоўнай кніжкі не мае. Не інвалід, не калека. Жыве і п'е за кошт пенсіі маці. На ўсе ўгаворы, прафілактычныя гутаркі прадстаўнікоў мясцовай улады грамадзянін проста не рэагуе. Прыцягнуць да адказнасці яго няма за што: ён не парушае грамадскі парадак, ні з кім моцна не канфліктуе — ён ціхі алкаголік. Маці на сына ні разу не паскардзілася.

— Што рабіць у гэтым канкрэтным выпадку, — разважае **старшыня Мілавідскага сельскага Савета дэпутатаў Наталля ДАВІДОВІЧ,** — я проста не ведаю. Але пакідаць у спакоі спецыфічны вясковы кантынгент не варта, мы дакладна не маем на гэта права. Нават калі ўдасца выправіць 5, 10, 15 працэнтаў людзей, што вядуць паразітычны лад жыцця, змагацца за гэта трэба. Так што закон, пра неабходнасць якога актыўна загаварылі апошнім часам, на мой погляд, патрэбен.

Сёння, напрыклад, можна гаварыць, што Дэкрэт № 18 у многім мае станоўчыя вынікі. У нашым сельсавеце пражывае дзве сям'і абавязаных асоб. Сужэнцы М., у якіх забралі сямёра дзяцей, працуюць у сельгаспрадпрыемстве. У сэнсе працоўнай дысцыпліны да іх пытанняў няма, яны спраўна ходзяць на работу, выконваюць яе ў поўным аб'ёме. Праўда, зарплаты ў іх невысокія, а доўг за дзяцей даволі вялікі. Пакуль яны яго не пагасілі. Але ўсё часцей — асабліва маці — гавораць аб тым, што хочуць вярнуць дзяцей у сям'ю. Ужо зрабілі часткова рамонт у хаце. І ўсё ў іх атрымалася б, каб час ад часу не зрываліся і не выпівалі зноў. Таму перспектывы на ўз'яднанне сям'і пакуль даволі туманныя. Пра гэта кожны раз нагадваю абавязаным — у спадзяванні, што адумаюцца і канчаткова возьмуцца за розум. А вось маці дваіх дзяцей, якую прымусова ўладкавалі на працу ў горадзе, трэба ледзь не за руку вадзіць, бо да працоўнага месца яна можа і не дайсці.

— Крыўдна, — лічыць Наталля Віктараўна, — што кругом шмат працы, а маладыя, фізічна здаровыя мужчыны днямі слоняюцца ў радыусе паўкіламетра ад магазіна. У СВК работа, асабліва сезонная, заўсёды знойдзецца. У вёсках трэба разбіраць старыя трухлявыя дамы, шмат чаго рабіць па добраўпарадкаванні, праца ёсць і ў фермерскай гаспадарцы… Было б жаданне! А калі жадання няма, то, на яе погляд, трэба прадугледзець нейкія механізмы прымусовай карыснай працы.

А вось якім чынам гэта арганізаваць, ніхто не ведае. Цяпер у кожнай вёсцы, кожным сельсавеце ёсць людзі, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. І нельга сказаць, што імі не займаецца мясцовая ўлада, прадстаўнікі праваахоўных органаў, адпаведныя раённыя структуры. Але відавочна, што мер, якія прымаюцца, недастаткова. У гэтым сэнсе красамоўным прыкладам можа быць гісторыя грамадзянкі Анісімавай з вёскі Парэ Пінскага раёна. Няньчацца з ёю каторы год, усе магчымыя захады рабіліся на розных узроўнях. Вынік жа — амаль нулявы. 41-гадовая жанчына не так даўно вярнулася з ЛПП, але высноў не зрабіла, і мясцовы ўчастковы пасля чарговай (якой ужо па ліку) гутаркі пачаў рыхтаваць дакументы зноў у той жа прафілакторый.

> **“Жанчыну ўжо ўладкоўвалі ў СВК «Ласіцк» — але яна там толькі ўсім нервы папсавала, бо працавала роўна столькі, колькі побач стаяў участковы. Як толькі ён пайшоў — яна і збегла. Каму патрэбна такая работніца?**

У названай установе сёння знаходзіцца і яе 20-гадовая дачка. Яшчэ чацвёра малодшых дзяцей змешчаны ў прытулкі і розныя інтэрнатныя ўстановы. Грамадзянка даўно пазбаўлена бацькоўскіх правоў.

На гэты раз, як расказалі ў сельсавеце, яна амаль што клялася, што больш за старое не возьмецца, што пойдзе працаваць, піць не будзе. Нават слязу пусціла наконт сваёй пакрыўджанасці лёсам, людзьмі, дзяржавай. А калі разабрацца — хто яе крыўдзіў? Хіба толькі родная маці. Яна ў свой час кінула малую дачку ў бацькоў і з'ехала ў Расію. Дзяўчынку бабуля сяк-так выгадавала. Ды тая пайшла па шляху маці — стала піць і паралельна нараджаць дзяцей.

Цяпер вось хутчэй за ўсё зноў паедзе ў ЛПП. Магчыма, сустрэнецца там са старэйшай дачкой. Апошнюю, калі яна скончыла школу-інтэрнат, спрабавалі ізаляваць ад уплыву маці-алкагалічкі. Дзяўчыне далі сацыяльную кватэру ў Пінкавічах, ля самага Пінска.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ХТО Ў РАЁНЕ САМЫ РЭЙТЫНГАВЫ?

У Полацкім раёне вызначылі лепшыя сельсаветы, населеныя пункты, сядзібы, арганізацыі і нават будынкі. Сярод «канкурсантаў» былі і мясцовыя таленты. Усяго складзены рэйтынг у 27 намінацыях.

— Правядзенне такіх мерапрыемстваў сапраўды стымулюе кіраўнікоў і жыхароў населеных пунктаў уносіць пасільны ўклад у развіццё роднага краю, беражліва ставіцца да элементаў добраўпарадкавання. За апошнія гады на Полаччыне ўдалося значна палепшыць вонкавы выгляд і санітарны стан жылых тэрыторый, павысіць узровень камфортнасці жыцця сельскага насельніцтва. Дарэчы, апошняе і стала галоўным крытэрыем пры складанні рэйтынгавай сеткі, — расказаў **Пётр ПЯТКЕВІЧ, намеснік старшыні Полацкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях.**

Спісы самых рэйтынгавых размешчаны на афіцыйным сайце Полацкага райвыканкама.

У верасні перад кіраўнікамі сельсаветаў была пастаўлена задача: вызначыць па розных намінацыях самыя рэйтынгавыя населеныя пункты ў раёне, тым самым пазначыўшы ўзровень паспяховай дзейнасці, папулярнасці арганізацый і асобных людзей. Члены арганізацыйнага камітэта падвялі вынікі рэйдаў, праведзеных у населеных пунктах, і вывучылі прадстаўленыя кіраўнікамі сельвыканкамаў адпаведныя матэрыялы. З 27 намінацый *(летась іх было 12.* — **Аўт.)** аб'ёмнай рэйтынгавай сеткі выбраны лепшыя з лепшых: людзі, арганізацыі, сядзібы, будынкі, вёскі…

У прыватнасці, у лідарах аказаўся Зелянкоўскі сельсавет, які заняў першыя месцы па 13 намінацыях. На другім месцы — Палатоўскі сельсавет, «бронзавы прызёр» — Ветрынскі, расказала **Валянціна УЛАСЕНКА, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама.**

Той жа Ветрынскі сельсавет — лідар і па добраўпарадкаванні ўстаноў адукацыі, медыцыны, сельскіх дамоў культуры, бібліятэк, гандлёвых аб'ектаў, населеных пунктаў і сядзіб.

У «топавым» спісе — 10 самых добраўпарадкаваных населеных пунктаў Полацкага раёна. На першым месцы — вёска Фарынава (другі раз запар), на другім — гарадскі пасёлак Ветрына, на трэцім — аграгарадок Заазер'е.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.



КАНТАКТЫ І КАНТРАКТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Нагадала яна і пра ўзаемадзеянне з органамі мясцовага самакіравання іншых краін: расійскімі, украінскімі, прыбалтыйскім рэгіёнамі, рэгіёнамі Заходняй Еўропы. «У Беларусь часта прыязджаюць госці і бачаць, што ўлада клапоціцца пра чалавека, кожны мае права на працу, бясплатныя адукацыю і медыцыну. Але і вы павінны даносіць інфармацыю аб нашай краіне сваім замежным калегам, паказваць, што рэальна робіцца на месцы для паляпшэння дабрабыту насельніцтва. Такія зносіны, кантакты ніякімі публікацыямі ці віртуальнай сувяззю не заменіш». Таму, на думку старшыні пастаяннай камісіі, пабраціцкія сувязі трэба падтрымліваць, развіваць.

На тэрыторыі многіх сельсаветаў ёсць буйныя прадпрыемствы, як дзяржаўныя, так і прыватныя. Падчас абмену вопытам на ўзроўні мясцовага самакіравання можна вырашаць і эканамічныя пытанні, рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты, заключаць выгадныя кантракты. Пасялковым і сельскім Саветам дэпутатаў неабходна ў поўнай меры выкарыстоўваць асабістыя паўнамоцтвы, каб стаць на сваіх тэрыторыях сапраўднымі гаспадарамі, здольнымі бачыць і вырашаць праблемы. Нагадала сенатар і пра тое, што варта больш актыўна і эфектыўна працаваць над зносам старых дамоў, выкарыстаннем пустуючых, па-гаспадарску распараджацца зямельнымі ўчасткамі, што вызваляюцца.

У гэтым кантэксце гутарку прадоўжыў намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Вячаслаў Абрамаў.

«Нічыйнай» зямлі больш няма

— У 2004 годзе прыязджаю ў адзін сельскі Савет Мінскага раёна, з прадстаўніком зямельнай службы ідзём у поле. Цікаўлюся ў яго: чые гэта ўчасткі? У адказ: «Не ведаю», — менавіта з гэтага прыкладу пачаў сваё выступленне Вячаслаў Анатольевіч.

Сапраўды, яшчэ гадоў 10–12 таму зямля лічылася як бы другаснай у параўнанні з будынкам, што стаяў на ёй. У мясцовых Саветаў дэпутатаў фактычна не было эканамічна абгрунтаванай ацэнкі зямельнага ўчастка, як і дзейсных механізмаў кантролю за абавязацельствамі землекарыстальнікаў. На пачатку 2000-х адбылася змена прыярытэтаў, прыйшло разуменне, што зямля — неаднаўляльны рэсурс, і падыход да яе выкарыстання павінен быць рацыянальным.

За гэты перыяд заканадаўства змянілася кардынальна: вызначаны тэрміны для засваення ўчастка, яго рэгістрацыі і наступствы пры іх незахаванні. Значная ўвага надаецца і скарачэнню колькасці пустуючых і старых дамоў, наведзены парадак у пытаннях, звязаных з выдзяленнем участкаў для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. Ды шмат іншага зроблена. У прыватнасці, пры выкупе, арэндзе зямельных участкаў стартавая цана іх набліжаецца да кадастравага кошту. Згодна з заканадаўствам, гэты кошт мяняецца раз у пяць гадоў. «У тым ліку актуалізаваць яго могуць і выканкамы. У тым выпадку, калі палепшыцца эканамічная сітуацыя, рэгіён пачне больш эфектыўна развівацца».

Калі норма не прыжываецца

«Зямельнае заканадаўства часта мяняецца, — канстатаваў намеснік старшыні Дзяржкамітэта па маёмасці. — Звязана гэта з тым, што ідзе пастаянная апрабацыя тых ці іншых нормаў. Ад тых, што не прыжыліся на практыцы, адмаўляюцца. Напрыклад, варта ўзгадаць норму, што абмяжоўвала выдзяленне зямельных участкаў для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. Іх маглі атрымліваць жыхары, зарэгістраваныя ў сельскай мясцовасці на тэрыторыі адпаведнага Савета, з агаворкай: толькі пры наяўнасці ўчастка, прадугледжанага генеральным планам населенага пункта. Але норма не працавала, паколькі ў большасці паселішчаў у сельскай мясцовасці проста няма генеральнага плана развіцця. І летась гэтыя патрабаванні адмянілі».

На сённяшні дзень вызначаны вельмі строгі парадак і механізм прадастаўлення зямельных участкаў. У эканамічна актыўных рэгіёнах (зоны вакол буйных гарадоў, абласных цэнтраў) яны прапаноўваюцца ўсім катэгорыям грамадзян праз аўкцыёны, акрамя тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Пры гэтым чалавек не можа прадаць участак да заканчэння 8 гадоў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомасці. Такая работа дазволіла павысіць эфектыўнасць выкарыстання зямельных участкаў па прызначэнні.

Часта старшыні сельскіх і пасялковых Саветаў сутыкаюцца з пытаннямі, калі мясцовыя жыхары хочуць правесці адчужэнне ўчастка для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома. «Тут варта ўлічваць дзве рэчы. Тое, што дзяржава, выконваючы свае сацыяльныя абавязацельствы, клапоціцца пра грамадзян, дае ім магчымасць палепшыць жыллёвыя ўмовы шляхам будаўніцтва індывідуальных дамоў. І другое — эканамічную эфектыўнасць і мэтазгоднасць, — растлумачыў Вячаслаў Абрамаў. — Датэрмінова могуць правесці адчужэнне дзве групы людзей. Сюды ўваходзяць афіцыйна пераведзеныя на работу ў іншы рэгіён і тыя, што атрымалі першую і другую групу інваліднасці. У іншых сітуацыях, калі ўзнікае жыццёвая неабходнасць, адчужэнне робіцца мясцовымі распарадчымі і выканаўчымі органамі».

Цікавіліся прысутныя, як быць з тымі, хто стаяў на чарзе на атрыманне ўчастка два-тры гады. Цяпер аблвыканкам сваім распараджэннем уключыў населены пункт у аўкцыённую зону. На што Вячаслаў Абрамаў адказаў, што, перш чым прыняць такое рашэнне, варта было правесці адпаведную працу з насельніцтвам. А на пытанні, якія патрабавалі ўдакладнення, спецыяліст адказаў асабіста кожнаму пасля сустрэчы.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ЛЮДЗІ СВАБОДНЫХ НОРАВАЎ...

Працы ў вёсцы заўсёды хапае...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Але брацца за розум яна не спяшалася. У яе адразу ж з'явіўся сужыцель, яна нарадзіла дзіця і… пачала бязбожна піць. Калі паўстала пытанне аб пазбаўленні маладой маці бацькоўскіх правоў, сужыцель, на дваццаць гадоў старэйшы, усынавіў дзіця, вырашыў забраць яго і выхоўваць са сваёй маці. У вёсцы кажуць, што ён меў больш сур'ёзныя намеры, хацеў стварыць нармальную сям'ю. Але ў нейкі момант не стрымаўся і «павыхоўваў» п'яную маладзіцу.

Пабоі аказаліся моцнымі, яго пасадзілі ў турму. Апякунства над малым аформіла яго маці… Вось такая вясковая «Санта-Барбара», і падобнымі гісторыямі цяпер, на жаль, не здзівіш.

Якія меры можна прымяніць да грамадзянкі Анісімавай, што мае дзясяткі мільёнаў доўгу за ўтрыманне сваіх дзяцей і рыхтуецца чарговы раз у ЛПП? Як бачым, прымусіць працаваць яе нерэальна. Жанчыну ўжо ўладкоўвалі ў СВК «Ласіцк» — але яна там толькі ўсім нервы папсавала, бо працавала роўна столькі, колькі побач стаяў участковы. Як толькі ён пайшоў — яна і збегла. Каму патрэбна такая работніца?

Такіх грамадзян можна прымусіць працаваць, толькі змясціўшы іх у бестэрміновыя ЛПП, лічаць у Ласіцкім сельсавеце. Іншыя захады будуць марнымі.

Цяпер, на вялікі жаль, не толькі ў кожным сельсавеце, але і ў кожнай вёсцы можна знайсці людзей, якія жывуць за чужы кошт. Часцей за ўсё галоўнай крыніцай іх даходу становіцца пенсія састарэлых бацькоў. Вельмі часта гэтыя бацькі альбо баяцца, альбо не лічаць патрэбным паскардзіцца. Добра яшчэ, калі іх сын — ціхі алкаголік, пра якога гаварылася ў самым пачатку. Але калі ў Мілавідскім сельсавеце падчас акцыі «Дом без гвалту» правялі ананімнае анкетаванне, то многія адказы на пытанні анкеты вельмі засмуцілі, расказвала старшыня сельвыканкама. Аказалася, што сапраўднаму гвалту з боку алкаголікаў падвяргаюцца старыя бацькі, жонкі, дзеці. Гэтыя людзі маюць толькі адну мэту ў жыцці — адабраць грошы ў каго-небудзь і выпіць. Калі выпрасіць грошы не ўдаецца, яны выбіваюць іх з родных. І такіх, на жаль, становіцца больш.

Не так даўно давялося гаварыць з кіраўніком аднаго з прадпрыемстваў Ленінскага раёна г. Брэста. Паскардзіўся, што яму пастаянна навязваюць так званых абавязаных работнікаў. Гэта толькі разбэшчвае людзей. І так яму гэта абрыдла, што ён гатовы заплаціць усю суму, якую яны павінны дзяржаве, толькі б вочы іх не бачылі.

— І мы ўсё часцей сутыкаемся з падобнай пазіцыяй, — сказаў **намеснік начальніка Ленінскага РАУС Брэста Аляксандр КУГАЧ.** — Нашы ўчастковыя некаторых літаральна за руку на работу водзяць. Можа, і варта было б стварыць для такога кантынгенту спецустановы. Але зразумела, што для гэтага спатрэбяцца немалыя сродкі. Нават калі людзі там будуць працаваць толькі за харчаванне, утрыманне іх абыдзецца бюджэту ў капеечку. Таму варта ўсё як след пралічыць і ўзважыць.

Адназначна, цярпенне грамадства ў дачыненні да «спецкантынгенту» дайшло да краю, і рабіць нешта трэба — хаця б для таго, каб абараніць старых, перш за ўсё ў вёсцы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЭКАНОМІЦЬ НА ЎСІМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Навошта назапашваць смецце?

У сваіх імкненнях забяспечыць якаснае абслугоўванне глускія камунальнікі нават перастараліся. Напрыклад, пры амаль 99% ахопе насельніцтва санітарнай ачысткай у Глуску і больш чым на 95% у раёне, тут, акрамя палігона цвёрдых адходаў, існуе 14 міні-палігонаў і 55 пляцовак часовага складзіравання бытавых адходаў.

— Навошта так шмат, калі Жылкамгас заключае дагаворы з людзьмі і згодна з графікам забірае смецце? — здзіўляецца старшыня Магілёўскага аблсавета Анатоль Ісачанка. — Не трэба каля кожнай хаты рабіць звалку. На мой погляд, пляцовак быць не павінна, для збору смецця хопіць існуючых палігонаў. Два ці пяць — трэба вызначыцца. Астатнія трэба прыбраць.

З бытоўкай таксама ёсць недапрацоўка, лічыць старшыня аблсавета. Сёлета за 9 месяцаў страты па сельскіх комплексных прыёмных пунктах у раёне склалі 218 мільёнаў рублёў! Нават больш, чым летась за год. Вяскоўцам прадастаўляюцца паслугі па рамонце швейных вырабаў, абутку, мэблі, тэле- і радыёапаратуры і іншае — усяго 11 пазіцый. Некаторыя, здаецца, не мяняліся яшчэ з савецкага перыяду, калі адчуваўся недахоп пральных машын і фотаапаратаў.

— А чаму б не паспрабаваць шыць спецадзенне для мясцовых работнікаў? — спытаў Анатоль Ісачанка. — Мы пакуль працуем шаблонна: стрыжка, рамонт халадзільнікаў, тэлевізараў. Зараз што, халадзільнікі часта ламаюцца? Купіў — і ён працуе шмат гадоў. Ці трэба займацца рамонтам? Ёсць жа шмат іншых кірункаў. У вёсцы можна старому чалавеку адрамантаваць агароджу, дах падправіць, дровы пакалоць, прыбраць у доме, агарод узараць. Дзеці, калі прыязджаюць да сваіх бацькоў, не заўсёды гэтымі справамі займаюцца. Звычайна ў іх проста не хапае часу.

У Залескім Доме рамёстваў адраджаюць народныя промыслы.

24 мільёны — на вучня

Можна бясконца шкадаваць аб тым, што закрываюцца малакамплектныя школы ў нашых вёсках. Але калі нічога не мяняць, лепш жыць не пачнём. Лічыце самі: у горадзе на ўтрыманне аднаго вучня патрэбна 1,37 мільёна рублёў, а вось на вёсцы — амаль 24 мільёны. Адчуваеце розніцу? Тое ж самае датычыцца і іншых устаноў. Чым менш людзей, тым даражэй утрымліваць тыя ці іншыя аб'екты.

— Сацыяльныя стандарты — гэта не догма, — лічыць старшыня Асіповіцкага райсавета Аляксандр Пузік. — Задача раённых улад — удасканаліць сістэму — нешта закрыць, ушчыльніць. Калі вясковы вучань абыходзіцца ў разы даражэй за гарадскога, можа, трэба больш уважліва вывучыць мэтазгоднасць такой школы. Калі гэта пытанне актуальнае для Асіповіцкага раёна, то для таго ж Глускага, які ў тры разы меншы, яно таксама існуе. Разам мы шукаем шляхі вырашэння такіх праблем.

— Тое, што мы абмяркоўваем выкананне сацстандартаў на прыкладзе некалькіх раёнаў, асабліва каштоўна, — упэўнены старшыня Глускага райсавета Андрэй Баброўнік. — Наш раён быў абраны не таму, што ён горшы ў чымсьці ці паказальны. Галоўнай мэтай было разгледзець менавіта сацыяльныя стандарты. На месцах яны ў асноўным нават перавыконваюцца, але трэба разумець, чаго гэта каштуе.

Бываюць і «перакосы»

Працу дэпутатаў у Глуску можна з аднолькавым поспехам назваць семінарам, вучобай, нарадай.

«Каб знаходзіць аптымальныя рашэнні, мы вырашылі раз у месяц ці ў два збірацца на базе аднаго з раёнаў і глядзець, чаму там можна павучыцца ці, наадварот, як паўплываць на слабыя месцы, — кажа Анатоль Ісачанка. — У кожнага старшыні райсавета будзе шанц выказацца, унесці сваю прапанову. Напрыклад, у Глускам раёне добра арганізаваны збор малака. Усюды праблемы, а тут прыватнікі працуюць, абслугоўваюць больш за дзве сотні дамоў. І людзям добра, і прадпрымальнікам.

Мясцовыя ўлады самі зацікаўлены ў такіх сустрэчах. Бывае, вока «замыльваецца», а бывае, падначаленыя не ўсё скажуць. А калі разам разбірацца, усё навідавоку. У асноўным сацстандарты выконваюцца, але іх трэба карэктаваць. Частка з іх сёння не такая актуальная, як раней. Сустракаюцца і перакосы. Па некаторых пазіцыях мы зрабілі эканамічныя разлікі і былі ўражаны. Напрыклад, пры норме 4 аўтобусныя рэйсы ў тыдзень атрымлівалася лічба ў 7 (!) разоў вышэйшая. Як высветлілася, уся справа ў тым, што кожны вядзе ўлік па сваім разуменні. А так быць не павінна.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

НАВІНЫ РЭГІЁНА

Сучаснае абсталяванне і камфорт

Чарговым крокам у маштабным абнаўленні ўстаноў аховы здароўя Гродзеншчыны стала завяршэнне другога этапу рэканструкцыі абласной інфекцыйнай бальніцы.

«Новае жыццё» атрымаў яшчэ адзін лячэбны корпус, дзе заменены ўсе інжынерныя камунікацыі, абсталявана лакальная камп'ютарная сетка і створаны камфортныя ўмовы ў палатах. Бальніца не толькі ўмацавалася сучасным медыцынскім абсталяваннем, але і вырашана важнае для спецыфікі гэтай лячэбнай установы пытанне раздзялення плыняў пацыентаў з інфекцыйнымі захворваннямі.

Народны артыст Астравеччыны

Конкурс пад такой назвай аб'яўлены рэдакцыяй газеты «Астравецкая праўда» сумесна з аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама і раённай арганізацыяй Беларускага саюза жанчын.

Каб стаць народным артыстам Астравеччыны, трэба, зразумела, добра спяваць. І пры гэтым мець у рэпертуары песню ў сольным выкананні, якая пасля запісу ў фармацэ MP3 з'явіцца на сайце раённай газеты, каб затым метадам народнага галасавання вызначыць пераможцу. Яшчэ аднаго лаўрэата конкурсу назаве кампетэнтнае журы. Дарэчы, абмежаванняў па ўзросце для канкурсантаў не існуе. Адзіная ўмова: яны павінны быць жыхарамі ці ўраджэнцамі Астравеччыны.

Сфера паслуг у новым фармаце

Самыя розныя паслугі прапануюцца ў гандлёвым цэнтры «Сіці», нядаўна пабудаваным у Ашмянах. Пад адным дахам размясціліся прадпрыемствы гандлю (у прыватнасці, крамы па продажы тавараў для дзяцей, шпалер), касметычны кабінет, салярый, майстэрня па вырабе ўсялякіх стэндаў, іншай рэкламнай прадукцыі.

Актыўна развіваецца на Ашмяншчыне і сеткавы гандаль, прычым з удзелам мясцовых інвестараў. Напрыклад, на адным з зямельных участкаў, адведзеных на гэтыя мэты райвыканкамам, тутэйшы прадпрымальнік Міхаіл Радцэвіч пабудаваў будынак супермаркета адной з гандлёвых сетак. Якому, дарэчы, давядзецца працаваць у выгадных для пакупнікоў (па таварным асартыменце і цэнах) умовах канкурэнцыі, бо неўзабаве запланавана будаўніцтва ў раёне аб'ектаў і іншых сеткавых структур.

Супербабулі «запальваюць»!

У атмасферы шчырасці і пад гучныя апладысменты шматлікіх гледачоў у Гродне ўжо другі раз прайшоў конкурс «Супербабуля-2014».

Удзельніцы прадстаўлялі сябе сцэнічнай «візітоўкай», дэманстравалі свае творчыя і кулінарныя здольнасці, а таксама разам з маладымі людзьмі паказвалі дэфіле ўбранняў і прычосак.

— Бачыце, якія прыгажуні! — кажа арганізатар конкурсу, старшыня Кастрычніцкай раённай арганізацыі Беларускага фонду міру Жанна Грыцкевіч.

— Сённяшнія дзеткі не надта актыўныя, і мне даводзіцца паказваць прыклад, — усміхаецца трохразовая бабуля і двухразовая прабабуля, 75-гадовая Тамара Сянькова — майстар спорту па спартыўнай гімнастыцы, якая таксама займалася валейболам, канькамі, лыжамі, плаваннем, яздой на матацыкле і нават скачкамі з парашутам.

Удзельнікаў конкурсу ўзнагародзіла леташняя пераможца Вольга Алісіевіч.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПІЛЬНЫ СТАРАСТА ЗНАЙШОЎ ГРАНАТУ... У СЛУПЕ

Боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны ў нашай зямлі — не навіна. Іх знаходзяць да гэтай пары, асабліва падчас уборкі ўраджаю. Знаходзяць і пры будаўніцтве ў свежым катлаване… Але каб у бетонным слупе на вышыні амаль двух метраў! Такога не памятаюць нават бывалыя сапёры.

У невялікай вёсачцы Хмялёўка Маларыцкага раёна лінію электрапередач мянялі гадоў дваццаць таму. Бетонныя апоры з той пары спраўна падтрымлівалі правады і забяспечвалі вёску светам. Але на адным з іх адваліўся кавалак бетону, і **староста вёскі Мікалай МАКСІМУК** заўважыў прадмет, які вельмі ж нагадваў боепрыпас. Мікалай Іванавіч тут жа патэлефанаваў дзяжурнаму МНС. У выратавальнікаў таксама амаль не засталося сумненняў, што ў слупе замуравана граната часоў вайны. Была выклікана група размініравання, спецыялісты якой боепрыпас абясшкодзілі.

Як паведаміў **старшыня Олтушскага сельскага Савета дэпутатаў Вітольд ПЯТКЕВІЧ,** адлегласць ад небяспечнага слупа да бліжэйшага дома каля 50 метраў. Таму з гэтага і суседняга дамоў жыхароў на час аперацыі эвакуявалі.

Усяго ў вёсцы Хмялёўка, паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, пражывае да паўсотні чалавек.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«НЕМАЛЕНЬКІ» БІЗНЕС

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— У нас у кожным рэгіёне створаны камісіі па развіцці малога прадпрымальніцтва і арганізацыі новых вытворчасцяў, — кажа яна. Ва ўсіх раёнах іх узначальваюць старшыні райвыканкамаў. Для арганізацыі суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва вытворчасці тавараў (работ, паслуг) райгарвыканкамамі вызначана 66 зямельных участкаў агульнай плошчай звыш 435 га, а таксама 26 нявыкарыстаных аб'ектаў нерухомасці. Станоўчым прыкладам з'яўляецца арганізацыя прамысловай пляцоўкі на тэрыторыі былой воінскай часці ў Жлобінскім раёне. На плошчы каля 13 га цяпер працуе 18 прадпрыемстваў і створана амаль 100 новых працоўных месцаў.

На пасяджэнне раённай камісіі па развіцці малога прадпрымальніцтва і арганізацыі новых вытворчасцяў, дарэчы, можа прыйсці любы чалавек без папярэдняга запісу і вырашыць усе пытанні, якія тычацца яго бізнесу: ад зямельных адносін да працоўных. Калі трэба, яму прапануюць зямельны ўчастак або маёмасць, якая не выкарыстоўваецца, — для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. Між іншым, за кожным бізнес-праектам замацоўваецца адказны супрацоўнік раённага выканкама і суправаджае яго. З боку аблвыканкама гэта яшчэ і фінансаванне новых праектаў у межах праграмы падтрымкі прадпрымальніцтва. (У верасні, дарэчы, разглядаўся ход яе рэалізацыі на выязной сесіі прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў.) Такім чынам, можна сказаць, што на тэрыторыі Гомельскай вобласці на ўсіх узроўнях надаецца пільная ўвага развіццю малога і сярэдняга бізнесу.

Ну а тыя, хто сапраўды разважае аб адкрыцці свайго бізнесу, павінны ведаць, што працэдура рэгістрацыі новай справы зойме не вельмі шмат часу: максімум тры дні.

— Адкрыццё бізнесу, самі разумееце, справа нятанная. Тым больш што кошт крэдытных рэсурсаў сёння дастаткова дарагі. Калі няма стартавага капіталу, будзе цяжка. Але ж калі стартавы капітал ёсць — праходжанне адміністрацыйных працэдур рэгістрацыі не складзе праблем. У кожнай сітуацыі могуць быць розныя нюансы, але мы імкнёмся вырашыць усё вельмі хутка. Для буйных бізнес-праектаў у нас створаны Савет па садзейнічанні развіццю інвестыцый, які ўзначальвае старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік. Усе пытанні заключэння інвестыцыйных дагавораў, унясенне змен, скасаванне ці нейкія іншыя праблемы вырашаюцца кожны панядзелак на ўзроўні кіраўніка вобласці. Такім чынам, у нас на ўсіх узроўнях створана сістэма работы з бізнесам: ад буйнога да самага маленькага. Вядома, бываюць непаразуменні і перагібы, але ж мы пастаянна прымаем удзел у рабоце раённых камісій, а пры неабходнасці дапамагаем на абласным узроўні.

Дарэчы, Асамблеяй дзелавых колаў Рэспублікі Беларусь Гомельшчына сёлета ўжо другі раз прызнана лепшай вобласцю для вядзення бізнесу ў краіне. У намінацыі «Лепшы раён для бізнесу Беларусі — 2014» перамог Чачэрскі раён. У гэтым жа рэспубліканскім конкурсе сярод лаўрэатаў абласны цэнтр, а таксама Гомельскі і Нараўлянскі раёны. Дарэчы, многія са старшынь сельскіх Саветаў актыўна працуюць па ўцягванні ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца.

12 099 з 39 144 суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, ці 31% ад агульнай колькасці, размешчаны на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх населеных пунктаў і сельскай мясцовасці Гомельскай вобласці.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Сёння, асабліва ў сельскай мясцовасці, ідзе аптымізацыя і ў сферы адукацыі, і ў сферы культуры, — расказвае Марына Крывунь. — А значыць, вызваляецца шмат памяшканняў, якія раней былі школамі, дамамі культуры… Гэтыя будынкі цяпер актыўна выстаўляюцца на аўкцыёны. І менавіта старшыні сельскіх Саветаў актыўна працуюць у гэтым кірунку. Яны ж робяць захады для захавання аб'ектаў, перадачы іх у іншыя рукі: ці сельгаспрадпрыемствам, ці прадпрымальнікам, ці грамадзянам — для вядзення ўласнай гаспадаркі. Між тым апошняя можа стаць першай прыступкай да прадпрымальніцтва. Чалавек, які сёння актыўна развівае сваю гаспадарку, заўтра, магчыма, стане фермерам. Іх колькасць, як і людзей, якія ствараюць аграсядзібы, пастаянна расце. Развіццё рамесніцтва, дарэчы, таксама можа стаць адной з прыступак да прадпрымальніцтва. І для гэтага створаны ўмовы: для рамеснікаў і для тых, хто займаецца аграэкатурызмам, сёння вызначана мінімальная падатковая нагрузка — 1 базавая велічыня ў год. Чалавек, які з'яўляецца рамеснікам, можа арганізаваць сваю школу, браць вучняў і на справе спрыяць захаванню традыцыйных рамёстваў. Калі ў людзей ёсць зацікаўленасць у стварэнні і развіцці бізнесу, ён будзе развівацца.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 19.679. Нумар падпісаны ў 19.30 11 лістапада 2014 года.

■ Вострый ракурс

АДМОЎСЯ САМ, А ДАРМАЕДУ ДАПАМАЖЫ?

Бясплатнае лячэнне беспрацоўных адбываецца за кошт сумленных падаткаплацельшчыкаў. Пакуль што

За кошт бюджэтных сродкаў у Беларусі медыцынскую дапамогу атрымліваюць у тым ліку грамадзяне, якія афіцыйна нідзе не працуюць. Колькі такіх у краіне — дакладна не падлічана.

Мая сваячка вярнулася з паліклінікі разгубленая. Тэрапеўт прызначыла ёй аналіз крыві толькі на адзін кампанент — гемаглабін. І гэта пры тым, што яна стаіць на спецуліку па захворванні, якое патрабуе штомесячнага кантролю крыві на хуткасці асядання эрытрацытаў — для кансультавання рэўматолага. Дарэчы, платнага. Бясплатнага рэўматолага ва ўстанове няма. Не, тэрапеўт нічога не пераблытала прызначыць — яна проста сэканоміла грошы паліклінікі...

Аказваецца, 20% людзей працаздольнага ўзросту з тых, хто праходзіў абследаванне і лячэнне ў гэтай медустанове, не маюць афіцыйна працы. Кожны пяты.

А тым часам па «хуткай дапамозе» ў бальніцу прывозяць людзей без пэўнага месца жыхарства, якія нідзе ніколі не працавалі, падаткі не плацілі. Хтосьці патэлефанаваў, што «ляжыць п'яны з разбітай галавой» — падабралі няшчаснага. Ён, пакуль везлі, крыху ачуняў і пачаў матам лаяцца на сваіх выратавальнікаў. А ў прыёмным аддзяленні ўвогуле даў такі «канцэрт», што медперсанал не ведаў, куды хавацца. Тым не менш яго памылі, пераадзелі і абслужылі па поўнай праграме: кансультацыі чатырох-пяці спецыялістаў з выкарыстаннем вельмі дарагога абсталявання — напрыклад, камп'ютарнай ці магнітна-рэзанансная тамаграфіі. Уяўляеце, колькі гэта каштуе? Ён тыдзень адляжаўся, крыху падкарміўся, у свежае адзеўся, але сумна стала — пайшоў шукаць новых прыгод. Калі знойдзе — зноў вернецца сюды ж, у цяпло і да ветлівага персаналу, які сцерпіць здзекі, сашчапіўшы зубы. ...Мая сяброўка-ўрач часта сустракаецца з гэтым кантынгентам і запэўнівае, што такія сітуацыі тыповыя для кожнай бальніцы, якая працуе з «хуткай».

Медыкі пацвердзяць, што і першая, і другая гісторыі характэрныя. «А як інакш, — кажуць, — мы ж клятву Гіпакрата давалі і ўвогуле жывём у сацыяльна арыентаванай дзяржаве». Гэта наконт сітуацыі з «бамжом». Наконт пенсіянерак: «Трэба ж выконваць план па платных паслугах, і ўвогуле — многія старыя ў паліклініку ходзяць «пагаварыць».

Дарэчы, тут можна пафасна выгукнуць: дзе ж сацыяльная справядлівасць? Чаму эканомяць на тых, хто плаціў падаткі, і не шкадуюць грошай на тых, хто ніколі не працаваў?

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алена Астапюк, член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы, сама нядаўна працавала ўрачом адной з гомельскіх паліклінік і па выкліках хадзіла штодзень. Яна ведае, наколькі розныя бываюць пацыенты. Гаворыць, што сутыкалася асабіста з тымі, хто вядзе асацыяльны лад жыцця і паражае медыкам пры сустрэчы:

— У нас бясплатная медыцына, і абслугоўваць мы павінны ўсіх грамадзян. Нельга падзяляць хворых на тых, хто працу мае, і хто яе не мае. Тым больш сітуацыя можа змяніцца для кожнага ў любы момант. Розныя ёсць людзі, але ж нашы прынцыпы гуманнай медыцыны не дазваляюць нам інакш ставіцца да іх. Тым больш што ў асобных выпадках асацыяльныя грамадзяне вярталіся да нармальнага жыцця, уладкоўваліся на працу і захоўвалі сем'і. Мы павінны быць чалавечнымі і дапамогу аказваць незалежна ад рангу і сацыяльнага статусу.

Алена Іванаўна лічыць, што людзям са складаным лёсам трэба дапамагаць працаўладкоўвацца, каб яны маглі зарабляць грошы, каб вялі здаровы лад жыцця і былі карысныя грамадству:

— У нас жа працы для ўсіх хопіць, у тым ліку сезоннай. Трэба больш займацца прафілактыкай, каб грамадзяне не траплялі ў стан, які патрабуе экстраннай дарагой медыцынскай дапамогі. Калі падымаюцца гэтыя пытанні, будуць прымацца і нейкія законы, каб вырашыць сітуацыю. Па-першае, трэба хаця б паспрабаваць падлічыць, колькі дармаедаў у нас насамрэч. Многія не працуюць афіцыйна, а ездзяць, напрыклад, на заробкі за мяжу краіны. Ці працуюць тут без запісу ў працоўнай кніжцы і падаткаў не плацяць. Мы будзем абмяркоўваць гэтыя пытанні падчас работы камісіі і шукаць магчымасці вырашэння праблемы.

Мікалай Васількоў лічыць, што ў перспектыве самае разумнае — на радзіме афармляць медыцынскую страхоўку грамадзянам, якія выязджаюць на заробкі ў Расію.

Дарэчы, пра статыстыку. У абласным аддзяленні медыцынскай статыстыкі аддзела аналізу і рэфармавання аховы здароўя, які знаходзіцца на базе Гомельскай абласной клінічнай бальніцы, дагэтуль не вылічваўся асобна паказчык тых, хто лечыцца, маючы статус беспрацоўнага. Не было «зверху» такога ўказання ў медыцынскіх статыстыкаў. Па маёй просьбе загадчыца аддзялення Лідзія Калугіна тэрмінова падлічыла, колькі такіх пацыентаў лячылася за паўгоддзе толькі ў абласной клінічнай бальніцы. Аказваецца, 20% людзей працаздольнага ўзросту з тых, хто праходзіў абследаванне і лячэнне ў гэтай медустанове, не маюць афіцыйна працы. Кожны пяты. Зразумела ж, з гэтага спіса былі выключаны дзеці і пенсіянеры.

Урач-хірург Гомельскага абласнога цэнтра тэрмічнай траўмы, ран, раневай інфекцыі і рэканструктыўнай хірургіі Аляксандр Маканін практычна штодзень працуе з пацыентамі групы рызыкі. Сюды ж вязуць і людзей, якія атрымалі цяжкія траўмы на заробках у Расіі. Што тычыцца асоб без пэўнага месца жыхарства, тут, кажа, куды падзецца — трэба лячыць нягледзячы ні на што. Так, як гэта робяць медыкі ва ўсіх цывілізаваных краінах, — за кошт бюджэту.

— Больш крыўдна, што тыя, хто працуе за межамі нашай краіны і там пакідае падаткі, у выпадку нейкай траўмы прыязджаюць лячыцца дадому, бо там, дзе яны траўмаваліся, прыйшлося б плаціць за лячэнне па поўнай праграме, — гаворыць Аляксандр Маканін.

Сапраўды, пацвярджае начальнік упраўлення аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама Мікалай Васількоў, згодна з пагадненнем 1997 года, толькі экстранная дапамога беларусам у Расіі і расіянам у Беларусі аказваецца бясплатна.

— Мы, як і яны, не бяром грошай за экстранную дапамогу. Але як толькі знікае пагроза для жыцця, дапамога становіцца платнай. Не кожны грамадзянін можа «пацягнуць» тую суму, якая выстаўляецца за аказанне плануемай платнай медыцынскай паслугі. Калі чалавек атрымаў траўму і будзе працягваць лячыцца ў Расіі, ён стане жабраком. У іх там муніцыпальны бюджэт вельмі абмежаваны, установы аховы здароўя фінансуюцца за кошт федэральнага. Па ім атрымліваюць квоты на пэўную колькасць пралечаных і дыспансерызаваных пацыентаў з замежжа. Яны не ў стане выдаткаваць вялікія сродкі на лекі, дыягностыку ці лабараторныя даследаванні. Таму, калі расійскія медыкі «атрымліваюць» грамадзяніна Беларусі, адразу ж тэлефануюць нам, каб мы забіралі яго на далейшае лячэнне.

Калі для расіян такая сітуацыя хутчэй выпадковасць, для беларусаў — справа звычайная. Проста таму, што нашых там працуе ў разы больш. Якое можа быць рашэнне праблемы? Мікалай Васількоў лічыць, што ў перспектыве самае разумнае — на радзіме афармляць медыцынскую страхоўку грамадзянам, якія выязджаюць на заробкі ў Расію:

— Што тычыцца сапраўдных дармаедаў, трэба абавязкова прымаць заканадаўчыя акты, каб іх прымусіць, зацікавіць, заахвоціць працаваць. Магчыма, калі-небудзь наступіць час, і наша краіна пяройдзе да страхавой медыцыны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■ Святло ў акне

ДЗЕВЯЦЬ ПА ДЗЕСЯЦЬ... І ЯШЧЭ КРЫХУ!

96-гадовая бабуля Марыя, адзіная жыхарка вёскі Бондарава Шумілінскага раёна, трымае карову, робіць з малака смятану, сыр... Гэта насамрэч унікальная жанчына, якая ў свае гады чытае без акуляраў, добра чуе, ды і памяць яе не падводзіць. Яна з задавальненнем мыецца ў лазні, сама падтрымлівае парадак. Наконт «рэцэпту», як доўга пражыць і нікому не стаць абузай, Марыя Андрэеўна Баранава кажа, што трэба працаваць, не шкадуючы сіл, і не піць спіртное. Вось, бадай, і ўсё.

Пра гэтую двойчы прабабулю мне расказалі ў Шумілінскім райсавеце. На жаль, вясковая моладзь у век інтэрнэту неахвотна трымае жывёлу. Маўляў, прасцей у краме тое ж малако купіць, або ў гаспадароў, якія кароў трымаюць. Пажылыя ж адмаўляюцца ад утрымання рагатых, свінак і іншай жывёлы з-за таго, што ўжо сілы не тыя...

— Вядома, і колькасць насельніцтва памяншаецца. — Гэта таксама адбіваецца на памяншэнні прыватнага статка... Наша Марыя Андрэеўна Баранава, упэўнена, сапраўдная рэкардсменка сярод тых гаспадынь у краіне (а можа, і ва ўсёй Еўропе), якая трымае карову. Бабуля нарадзілася ў 1918 годзе. Мне расказалі, што яна даяркай шмат гадоў адпрацавала. І цяпер без каровы не можа, — расказвае Ірына Новікава, старшыня Шумілінскага раённага Савета дэпутатаў.

Вырашылі разам наведаць паважаную малочніцу. Па дарозе да яе дома завіталі ў сельсавет.

— Марыя Андрэеўна жыве фактычна адна ў вёсцы Бондарава, але да яе штодня прыязджае сын. Сацыяльны работнік наведваецца. Так, яна трымае карову, толькі не здае дзяржаве малако, бо робіць з яго смятану і сыр, — расказвае Таццяна Дзятлава, старшыня Каўлякоўскага сельскага Савета.

Таццяна Анатольеўна паказала пагаспадарчую кнігу, дзе зменшчана інфармацыя пра пенсіянерку. У тым ліку адзначаны дата нараджэння пенсіянеркі (1 ліпеня 1918 года), а таксама, што яна трымае 1 карову.

Калі прыехалі да бабулі, высветлілася, што кароўка яе ацялілася літаральна за дзень да нашага візіту. Таму ў дакументе трэба будзе зрабіць папраўку.

— Я ж скончыла пяць класаў і ўсё жыццё кароў даіла. І ў Бешанковіцкім раёне, дзе нарадзілася (у вёсцы Асавец), і тут — у вёсцы Караліна. Пасля таго, як на пенсію выйшла, яшчэ гадоў дзесяць на ферме адпрацавала. Даіла каля дваццаці кароў, вядома, уручную: па тры разы штодня — летам, два разы — зімой. Паглядзіце, якія ў мяне рукі — немагчыма пальцы разагнуць, — расказвае пенсіянерка.

Яна з гонарам распаўляла і пра сваю цяперашнюю карову па мянушцы Красуля, якая ў чацвёрты раз ацялілася. Красуля (бачыў сам) насамрэч прыгажуня. Відавочна, што яе добра даглядае гаспадыня. У стойле не пахне гноем, усё ў ідэальным парадку.

— Сын у мяне добры. Ён у Бешанковічах жыве, але прыязджае, дапамагае мне ва ўсім. Яму ўжо за 70, але ж ён для мне дзіця. Дзве дачкі ў сына, ён ужо прадзед. А я — прапрабабуля, — кажа Марыя Андрэеўна.

Моладзь да яе прыязджае перыядычна, і яна ад душы частуе іх і адорвае гасцінцамі.

— Малака трэба, смятаны трэба! Шэсць курэй у мяне, але яйкі не ем. Усё ім і аддаю, бо куды дзяваць? Пенсію ж атрымліваю добрую — больш за 4 мільёны рублёў. Сыну даю — ён мне купляе нешта ў аўталаўцы: тут да мяне адной аўталаўка прыязджае.

На апетыт бабуля таксама не скардзіцца, на «дыетах» не сядзіць.

— Ды ўсё я ем! І пельмені люблю, і катлеты. Агуркі мне падабаюцца, але калі вельмі салёныя, тады непакоіць падстрыжнікавая залоза. Страўнік таксама ўжо не той... Праўда, як працаваць на ферме перастала, мне хацелі «батарэйку» ў сэрца ўставіць (расказвае пра кардыястымулятар. — **Аўт.**). Браліся зрабіць гэта ў мінскім навукова-даследчым інстытуце. Але ўрач знайшоўся добры ў Бешанковічах. Сам мяне і вылечыў. Лекі я асабліва ніколі не ўжывала. Цяпер вось карвалол, валідол, ды і ўсё... А, яшчэ «Мезім»... Як яго? «Фортэ». Але вельмі рэдка. Ну яшчэ і но-шпу. Ад галаўнога болю нічога не п'ю. Віно — і раней не піла многа, і цяпер не хачу, — здзіўляе нас пенсіянерка.

Бабуля Марыя.

Яе бацькі пражылі каля 90 гадоў, іх бацькі — таксама. Але пад 100 гадоў — такога не было ў іх сям'і.

Ці верыць яна ў Бога? Сказала, што так.

— Толькі не разумею, за што мне Бог столькі гадоў даў? Мусіць, чарга яшчэ не дайшла да смерці, — разважае доўгажыхарка.

Мы пажадалі ёй здароўя, падзякавалі за тое, што падзяліласяся з намі сваёй чыстай энергетыкай. Дамовіліся, што запросіць нас на 100-гадовы юбілей. На развітанне яна нас перахрысціла. Асабіста мне падалося, быццам перахрысціў анёл: з'явілася адчуванне лёгкасці і разуменне таго, што ў жыцці мы шмат часу трацім на мітусню. А каштоўнасць яго, жыцця, — у здароўі, у тым, каб да канца сваіх дзён не страціць розум, памяць. І, напэўна, яшчэ і ў тым, каб пасля смерці пра цябе ўспаміналі як пра чалавека, які не скардзіўся на жыццё...

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.

Шумілінскі раён

■

■ Кропкі над «і»

БАЛЫ НА ЦТ — НЕ ПАДСТАВА ДЛЯ РЭЙТЫНГУ

Рэйтынг школ Беларусі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання, які трапіў у беларускі сегмент інтэрнэту, не змяшчае крытэрыі, якія могуць выклікаць цікавасць бацькоў і навучэнцаў. У афіцыйным каментарыі, размешчаным на партале Міністэрства адукацыі, тлумачыцца, што «гэтая інфармацыя збіралася па заказу некаторых кіраўнікоў установ для спецыялістаў і педагогаў і не прызначалася для шырокага апублікавання».

Міністэрства складае рэйтынг установ адукацыі па выніках каляндарнага, а не вучэбнага года, гэта значыць, у студзені. Асноўная задача школы — падрыхтаваць вучня да дарослага жыцця, навучыць яго атрымліваць веды, таму вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, якое здаюць абітурыенты сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, не могуць быць адзіным крытэрыем для параўнання паспяховасці ўстаноў адукацыі.

Да таго ж установы агульнай сярэдняй адукацыі могуць адрознівацца па сваіх кірунках дзейнасці. У адных дзейнічаюць фізіка-матэматычныя ці лінгвістычныя класы, у другіх больш увагі надаецца экалагічным дысцыплінам, у трэціх — мастацкім дысцыплінам або працоўнаму навучанню. Але, напрыклад, матэматыку здаюць на ЦТ як вучні фізіка-матэматычных класаў, так і вучні класаў гуманітарнага профілю. І параўноўваць іх веды проста некарэктна.

Міністэрства адукацыі ацэньвае работу ўстаноў адукацыі комплексна — па многіх індыкатарах і крытэрыях, якія прадстаўлены грамадскасці на партале Міністэрства адукацыі ў раздзеле «Актуальна».

Надзея НІКАЛАЕВА

■

ПРА ГАЗЕТУ, БЕЛАРУСКУЮ МОВУ І САПРАЎДНАЕ МАСТАЦТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Газета для неабыякавай падпісчыцы заўсёды была каштоўным дарадцам.

— «Звязда» адпавядае ўсім запытам самага патрабавальнага чытача, — упэўнена яна. — Спатрэбілася даведка, як адмыць кухонныя шафкі — калі ласка. Шукаеш рэцэпт смачнай стравы? Ніякіх праблем! Шмат карыснага можна знайсці ў «Крынічцы». Як кусты саджаць, як яблыні абразаць, як даглядаць суніцы ці рыхтаваць да пасеву глебу — чытай і набірайся вопыту. А якая патрэбная і своечасовая ўкладка «Сямейная газета»! Сёння, на жаль, вельмі нізкі аўтарытэт сям'і, трэба яго павышаць. Газета робіць гэта з добрым веданнем справы. З задавальненнем чытаю артыкулы на старонцы «Усё пра Еву»: я хоць і пенсіянерка, але ж таксама хачу быць прыгожай. «Жырандоля» дапамагае быць у курсе таго, што адбываецца ў культурным свеце. А публікацыі «Ігуменскага тракту» (іх наогул можна выдаць асобнай кніжкай) натхнілі мяне на падарожжы. Сумесна з аднадумцамі з Савета ветэранаў аб'ехалі шмат цікавых мясцін Беларусі. Пабывалі ў Нясвіжы, Міры, на «Лініі Сталіна», у Хатыні, Мінску і шмат дзе яшчэ. Летась з'ездзілі ў Гомель, наведалі Палац Румянцавых-Паскевічаў. А сёлета двойчы пабывалі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Раю кожнаму туды зазірнуць.

Чытачка даражыць газетай яшчэ і таму, што яна адзіная ў Беларусі выходзіць на роднай мове. «Сёння нават у глыбінцы знайсці чалавека, з якім можна было б паразмаўляць па-беларуску, няпроста, — уздыхае яна. — У мяне ёсць адзін знаёмы, былы аграном. З ім толькі і атрымліваецца душу адвесці. Вельмі шкада, што мову амаль не пачуеш нават у нашых школах. Калі я працавала настаўніцай, мы з вучнямі размаўлялі па-беларуску не толькі на ўроках, але і вячоркі ў народных традыцыях праводзілі: танцавалі з маленькімі дзеткамі кракавяк, польку беларускую.

Зоі Самец даспадобы ўсё народнае, беларускае. «Наш ветэранскі ансамбль «Крыніца» таксама прапагандуе беларускія песні. Ездзім у маленькія вёскі, дзе нас прымаюць са шчырай душой. А калі выступалі перад ветэранамі Браншчыны, яны прызналіся, што нельга не ўлюбіцца ў такую прыгожую мову».

— Шукаем старыя песні, якія нашы дзяды-бабкі спявалі, і бяром на ўзбраенне, — з захапленнем расказвае сураз-моўца. — Напрыклад, ёсць у нас абрадавая песні «Жыта жала», якую пяем акапэльна.

Канцэртныя пляцоўкі ў «народных» артыстаў стыхійныя. Калі трэба, спяваюць на полі, у дварах дома, у клубе. Сёлета ў красавіку прайшоў тур па вёсках чарнобыльскай зоны — людзі на гэтыя канцэрты прыходзілі сем'ямі. А ў Новай Слабодцы артысты так «запалілі», што слухачы нават у скокі кінуліся.

— У нас са «Звяздой» — агульныя мэты, — запэўнівае Зоя Іванаўна. — Прапагандуем усё роднае, беларускае. І робім гэта аднолькава аддана. А той, хто лічыць, што жыцця ў вёсцы няма, памыляецца. Мы можам праводзіць час весела і змястоўна. Узяць, напрыклад, наш нядаўні раённы агляд-конкурс на «Лепшы ветэранскі падворак». Атрымалі 15 заявак ад ахвотных прыняць у ім удзел. Прыемна здзівіла, што нават у маланаселенай вёсцы Дубно адзінокая бабулька такі парадак падтрымлівае, што люба-дорага паглядзець. У нас вельмі шмат цікавых людзей — рукадзельніц, майстроў. Што ні чалавек, то знаходка. Так і напішыце. Няхай усе ведаюць і бяруць з нас прыклад!

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

■ Нефармат

НАСТАЛЬГІЯ ПА БЫЛЫХ ПРЫСМАКАХ

Адно з самых яркіх успамінаў дзяцінства: па кухні рассыпаліся аранжавыя апельсіны. Тады іх нават у райцэнтры, не тое, што ў вясковых крамах, і блізка не было. Бацька паехаў у Маскву атрымліваць фрэзерны станок для саўгаснай майстэрні і прывёз са сталіцы цэлы невялікі чамадан апельсінаў. Паставіў чамадан на табурэтку: і ці то знарок падстроіў, каб зрабіць уражанне, ці выпадкова той чамадан адчыніўся — і яркія духмяныя плады пасыпаліся па падлозе. Такога адчування прыгажосці за ўсё жыццё больш не памятаю...

Аранжавыя апельсіны ў нас паўсюль цяпер прадаюцца, а вось зялёных кубінскіх нідзе няма. У мае студэнцкія гады іх было колькі хочаш у Мінску. Яны каштавалі нават крыху танней за аранжавыя, якія мы называлі мараканскімі, бо іх найчасцей везлі з Марока. А кубінскія мелі большую кіслінку, але былі надта ж сакавітыя. З аднаго зялёнага апельсіна ледзь не шклянку соку можна было выціснуць. І мне здаваліся яны вельмі смачнымі.

Кожны раз, калі чытаю нейкія паведамленні пра стасункі з Кубай, уважліва праглядаю нават лічбы таваразвароту і пералік тавараў імпарту з кволай надзеяй убачыць радок пра пастаўкі апельсінаў з вострава Свабоды. Але марна. Відаць, цяпер гэта дорага і не вельмі выгадна. Або не знаходзіцца такога бізнесмена, які б пралічыў і ўзяўся за справу пастаўкі вітаміннай прадукцыі. А шкада. Смак зялёных кубінскіх апельсінаў нельга параўнаць з іншымі цытрусавымі, якіх цяпер багата.

А калі гляджу паведамленні пра гандаль з абласцямі з Далёкага Усходу, успамінаю марскую капусту з кукумарыяй. Яе мы куплялі ў бляшанках у самым канцы 1980-х. Тады я працавала ў пружанскай раённай газеце, а ў крамах райцэнтра можна было купіць толькі хлеб, малако, зрэдку вараную каўбасу і сякія-такія кансервы. З сяброўкамі па інтэрнацкім пакоі, такімі ж маладымі спецыялістамі, мы часта набывалі на абед гэту самую капусту з кукумарыяй. Часам елі яе з бульбай, і гэта было вельмі смачна. Што гэта за звер такі — кукумарыя, мы дакладна не ведалі. Тады ж не было інтэрнэту, які б хутка выдаў, што кукумарыя — малюск з сямейства ігласкурых, якія жывуць у Баранцавым, Японскім і Ахоцкіх марах. Кукумарыю часта называюць «марскім агурком» за яе выцягнутую форму, а некаторыя параўноўваюць яе з трэпангам. Аказваецца, у Японіі яе высока цэняць як карысны дыетычны прадукт. Мы гэтага зусім не ведалі і куплялі бляшанку марской капусты з вышэйназваным малюскам, калі ўжо зусім не было чаго есці. Тым больш што каштавала яна зусім танна. А потым, калі наступіла прадуктовае багацце, раптам захацелася той самай капусты з кукумарыяй, якую, дарэчы, вельмі нядрэнна гатавалі на адным з прадпрыемстваў Прыморскага краю. Ды ў магазінах нашай незалежнай краіны сустракаць яе не даводзілася. Неяк гаварыла пра смачны прадукт кіраўніку знакамітай «Санты». Падалося, ён нават зацікавіўся. Але гэтай прадукцыі ў нашым гандлі так і не паявілася. Цалкам верагодна, што патэнцыйныя пастаўшчыкі, як цяпер кажуць, змянілі цэнавую палітыку. І мяса малюска з сямейства ігласкурых аказалася надта дарагім. А кансервы, пра якія я казала, на аснове марской капусты, магчыма, ніхто не робіць ці нават прадпрыемства таго даўно няма.

Адным словам, застаюцца толькі ўспаміны. Як і пра «Ленінградскі» торт, які мы куплялі на святы ў студэнцтве. Потым, ужо ў ліхія 1990-я, седзячы ў дэкрэтным, я папрасіла мужа прывезці з Мінска гэты ласунак. Торт той мяне расчараваў, бо быў зусім не такім, як ранейшы. Не ведаю, можа, цяпер мінскія кандытары адрадзілі былы рэцэпт «Ленінградскага» торта. А вось такайскага віна, такога, якое прадавалі ў Мінску ў той час, я не здолела знайсці нават у Будапешце. Там яно, па-першае, вельмі дарагое, а па-другое, смак зусім не той. Так што кожная эпоха, відавочна, мае свае прысмакі. І адыходзяць яны часта разам з эпохай. На змену ім з'яўляюцца новыя.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

■ Факт

КАНЦЭРТ... У АБЛОКАХ

Гурт «J: Морс» упершыню ў гісторыі беларускай авіяцыі даў канцэрт на вышыні 10 кіламетраў, дык яшчэ і на хуткасці 250 метраў у секунду. Самалёт ляцеў з Мінска ў Амстэрдам. Да гэтага канцэрта музыканты рыхтаваліся каля месяца. Галоўнай тэхнічнай праблемай стала забеспячэнне дастатковай гучнасці, бо «лішнія» электрычныя прыборы ў самалёце падключаць нельга... У выніку доўгіх пошукаў быў знойдзены камплект апаратуры, якая можа працаваць толькі на батарэйках і акумулятарах. Але і гэта не вырашыла ўсіх праблем.

— Аказалася, што нават пасля дбайнай падрыхтоўкі даць канцэрт у аблоках зусім не проста, — распавядае лідар гурта Уладзімір Пугач. — Бо мы хоць і рэпетавалі «на борце», але ж на зямлі. А на вышыні ціск іншы, таму зусім інакш працуе дыханне, вушы закладвае, самалёт гойдаецца з боку ў бок. Увогуле, было шмат усяго нечаканага, але гэта таго каштавала! Дзякуй пасажырам за выдатную рэакцыю!

— Гурт «J: Морс» першым сярод беларускіх «зорак» даў канцэрт у палёце. Мы рады, што прынялі ўдзел у такім творчым праекце. Гурт ператварыў звычайны рэйс у сапраўднае свята, — пракаментаваў падзею Ігар Чаргінец, намеснік генеральнага дырэктара авіякампаніі «Белавія».

Акцыя была прымеркавана да 15-й гадавіны калектыву, якая будзе адзначана 22 лістапада вялікім сольным канцэртам «15 гадоў у аблоках». Ён адбудзецца ў мінскай зале Prime Hall. Але на тыдзень раней калектыў выступіць у Віцебску — 15 лістапада ў клубе «Планета».

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

XXI МІНСКІ МІЖНАРОДНЫ КІНА ФЕСТЫВАЛЬ ЛІСТАПАД 2014

НАША. ДАЎНЯЕ. НЕПАКІНУТАЕ

Айчыннае кіно вяртаецца пад музыку

Не, гэта не фанфары. Аднак яны былі б дарэчы: класіка беларускага кіно вяртаецца да айчыннага гледача. Насамрэч гэта балючае пытанне — беларуская культурная спадчына, якая апынулася па-за межамі краіны.

І вось жа хочацца мець і вярнуць назаўсёды, але часта такое немагчыма з розных прычын. І вось жа за апошнія дзесяцігоддзі ў краіне знайшлі спосабы вяртаць тое, што па прыродзе і паходжанні мае дачыненне да айчыннай гісторыі, вяртаць у культурны кантэкст — шляхам абменных выстаў з замежнымі партнёрамі, стварэння электронных копій (у выпадку з кнігамі). Наконт таго, што вялікая частка класікі айчыннага кіно пасля развалу СССР засталася ў Расіі, размоў вялося шмат. Раз-пораз (на працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў) адказнымі асобамі агучваліся словы наконт таго, што з Дзяржфільмафондам Расіі трэба супрацоўнічаць і дамаўляцца пра вяртанне стужак, якія маюць дачыненне да гісторыі беларускага кіно, каб краіна магла карыстацца сваёй спадчынай, грунт для якой закладваўся яшчэ з 1924 года, калі было створана Дзяржаўнае ўпраўленне па справах кінематаграфіі, а трошкі пазней, у 1928-м, узнікла студыя «Савецкая Беларусь» (спачатку ў Ленінградзе, пазней перабазіравалася ў Мінск). Беларускае кіно існуе з 1920-х гадоў, але не ўсё, што стваралася тады, на жаль, належыць Беларусі цяпер.

Кадр з фільма «У вялікім горадзе».

І вось у 2014 годзе атрымаўся фактычна прарыў у гэтым кірунку — на фестывалі «Лістапад». У адмысловай праграме «Рарытэт» разам з рэканструяваным польскім фільмам 1928 года «Пан Тадэвуш» былі паказаны 2 фільмы пад маркай «Класіка беларускага кіно», атрыманыя з калекцыі Дзяржфільмафонду Расіі, які валодае адной з лепшых кінематаграфічных калекцый у свеце (больш за 70 тысяч фільмаў і 967 тысяч ролікаў кінаматэрыялаў ад гістарычнай сусветнай кінакласікі да сучасных твораў). У тым ліку частка — тое, пра што не мае права забыць Беларусь.

У прыватнасці, фільмы «Саша» (створаны ў 1930 годзе) і «У вялікім горадзе» (1928 г.). Цікава, што нямыя стужкі мінулага стагоддзя былі агучаны — мелі музычнае суправаджэнне. Беларускія фільмы ішлі пад акампанемент вядомага гурта «Князь Мышкін», які кіруецца інтуіцыяй, каб стварыць імправізацыі. Для нямога кіно музыка не проста фон — гэта дадатковая фарба, экспрэсія, якая абвастрае ўспрыманне гледача. Тым больш што гэтае кіно сёння глядзіцца як ілюстрацыя недалёкай савецкай гісторыі праз драматычныя чалавечыя лёсы. Яны будуць больш зразумелыя гледачам сталага веку, якія пра задачы кіно савецкай эпохі ведаюць больш. Але моладзі, напэўна, будзе цікава, якім чынам гартаваўся савецкі чалавек. Героі гэтых фільмаў — простыя людзі, часта малапісьменныя, як у фільме «Саша» рэжысёра Аляксандры Хахловай. Але нават сялянка можа абудзіцца да жыцця і стаць паўнавартасным, актыўным членам грамадства. Таксама і ў фільме «У вялікім горадзе», створаным у суаўтарстве Маркам Данскім і Міхаілам Авербахам, ёсць развагі пра сапраўднае прызначэнне чалавека на прыкладзе двух герояў, якія, прыехаўшы ў Маскву, шукаюць для сябе новых магчымасцяў. Адзін з іх бачыць іх у працы, другі вядзе вясёлае жыццё... І хто сказаў, што гэта не актуальна сёння? Класіка ж і застаецца ў гісторыі менавіта таму, што размаўляе з людзьмі пра нешта вечнае, што існуе па-за часамі і эпохамі.

Таму так важна быць да яе далучаным. Таму шмат значыць нават сама магчымасць праглядаў стужак класікі айчыннага кіно. Цяпер іх будзе больш, таму што падчас фестывалю ў Мінску падпісана пагадненне паміж Дзяржаўным фондам кінафільмаў Расійскай Федэрацыі і дырэкцыяй Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» (якая прадстаўлена Цэнтрам візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн»).

Што нам дае гэтае пагадненне? Па-першае, спрашчаюцца працэсы атрымання копій стужак для паказаў у нашай краіне. Па-другое, іх можна будзе атрымліваць бясплатна. І па-трэцяе, не час ад часу, а рэгулярна, калі гэта трэба. У тым ліку гэтыя фільмы будуць дэманстравацца на Мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад», што павінна стаць добрым дапаўненнем да яго асноўных конкурсных праграм. І сведчаннем таго, што Беларусь — краіна кіно, у якога тут ёсць свая гісторыя і традыцыі. Між іншым, гэта найбольш важна менавіта для айчыннага гледача (асабліва маладога), які імкнецца спасцігнуць сутнасць такой з'явы, як «беларускае кіно», і зразумець працэсы, якія адбываюцца (ці не адбываюцца або ідуць марудна) у ім у наш час.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Край, дзе я жыву

Сумесны праект газеты «Звязда» і РГА «Белая Русь»

ЖЫВАТВОРНАЕ ВЕРЫ КРЫНІЦА

Кожную нядзелю, спяваючы ў хоры касцёла імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі, які знаходзіцца ў вёсцы Параф'янава Докшыцкага раёна, я не раз міжволі задумвалася аб тым, як узнікла наша святыня і хто стаяў ля вытокаў яе стварэння.

З гістарычных дакументаў і ад старэйшых людзей я даведалася, што першы касцёл у Парфенаве быў збудаваны ў 1620 годзе, знішчаны ў часе вайны 1654—1667 гг., адбудаваны ў 1675 годзе. Напрыканцы XIX стагоддзя было вырашана ўзвесці новы мураваны касцёл. Збор сродкаў на гэтую справу распачаў ксёндз-пробашч Баляслаў Корн у 1899 годзе, а ў 1900 годзе біскуп віленскі асвяціў вуглавы камень новага храма. Гліну для пабудовы касцёла здабывалі ў Парэччы. На цэгле, выраблена з той гліны, выціснуты ініцыялы Баляслава Корна. Стары будынак касцёла быў адсунуты ўбок, а ў сярэдзіне 1920-х — разабраны. Пабудова касцёла была завершана ў 1904 годзе.

Цікавы выпадак у гісторыі касцёла здарыўся ў 1942 годзе. У той час немцы здымалі з усіх храмаў у наваколлі званы. Пробашчам парафіі тады быў ксёндз Вячорак. Калі немцы пайшлі на вежу, каб зняць званы, ён зайшоў туды і нешта ім гаварыў. Што гаварыў — невядома, але званы не зняліся. Праўда, праз некалькі дзён ксяндза ўзялі пад хатні арышт, а потым забралі ў Беразвечча, дзе расстралялі. Апошнімі словамі яго былі: «Няхай жыве Бог, няхай жыве Айчына».

У параф'янаўскім касцёле ёсць партрэт ксяндза Мечыслава Багаткевіча. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ён служыў у касцёле на Глыбоччыне. Яго пропаведзі вельмі не падабаліся фашыстам. За гэта ён быў арыштаваны і закатаваны. Пасля вайны Папа Рымскі Ян Павел II разам з шэрагам ксяндзоў, загінулых у гады фашысцкай акупацыі, абвясціў яго благаслаўёным. А вось у нашым параф'янаўскім касцёле ён правёў сваю першую імшу.

У 1963 годзе касцёл быў закрыты ўладамі. У ім размясціўся склад мясцовага спіртзавода. Касцёл быў запоўнены смеццем ды рознымі скрынямі, унутр будынка заязджалі трактары і машыны.

Толькі з пачаткам перабудовы людзі пачалі пісаць звароты да ўлад, каб вярнуць касцёл. Нарэшце, у 1988 годзе вернікі дамагліся свайго. Першая за шмат гадоў імша была праведзена 2 лютага 1989 года. У 1992 годзе касцёл нанава асвяціў арцыбіскуп Казімір Свёнтэк. У тым жа годзе распачаў сваю працу айцец Тадэвуш Кавальскі. За 11 гадоў, калі ён быў пробашчам, касцёл быў поўнасцю адрамантаваны і адноўлены. За гэты перыяд была адноўлена капліца ў Кіякове, адкрыта новая капліца ў мястэчку Парфенава, абсталяваны парафіяльны дом. З 2001 года святая імша пачала праводзіцца на беларускай мове.

Штогод у ліпені наша парафія прымае пілігрымаў з Наваполацка, Віцебска, Глыбокага, якія ідуць на ўрачыстасць Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай, каб пакланіцца аднаму з найбольш шанаваных каталіцкіх абразоў Беларусі.

Хтосьці можа сказаць, што наша вёска паступова вымірае. Але я ўпэўнена, што, пакуль існуе «сэрца» Параф'янава, цэнтр духоўнасці — Параф'янаўскі касцёл імя Найсвяцейшай Панны Марыі, дзе кожную нядзелю збіраецца шмат людзей розных пакаленняў, наша вёска будзе прадаўжаць сваю гісторыю і напарадзе яе чакае толькі светлае будучае.

Юлія ЯНУКОВІЧ,
вучаніца 11 класа Параф'янаўскай сярэдняй школы Докшыцкага раёна.

P.S. Шаноўныя чытачы! Дасылайце нам свае матэрыялы пра гісторыю роднага краю, сваёй малой радзімы, пра выбітных асоб ці проста доўгажыхароў, якія сталі сведкамі пэўных гістарычных падзей. Вітаюцца таксама фота цікавых мясцін і краявідаў. Чакаем вашы артыкулы па адрасе: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а, газета «Звязда», з пазнакай «Край, дзе я жыву», або на электронны адрас info@zvyazda.minsk.by

ДРАНІКІ Ў АЎТАРСКІМ ВЫКАНАННІ...

Галоўны спецыяліст па сувязях з грамадскасцю галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Святлана ШЫЦКАВА патлумачыла:

— Тыдзень беларускай кухні праходзіць па прынцыпе адналькавых цэн і адналькавай рэцэптуры страў. Мы разам з «Суполкай кухараў» дакладна вызначаем інгрэдыенты, спосаб прыгатавання, як павінна выглядаць страва. Гэта робіцца для таго, каб на выхадзе ў розных установах атрымліваліся больш-менш адналькавыя стравы, нягледзячы на тое, што ўсюды працуюць розныя кухары. На гэты раз да нас далучылася рэкордная колькасць устаноў грамадскага харчавання — 85 кавярняў і рэстаранаў (мінулы раз было да 30) адгукнуліся на нашу прапанову і ўключылі гэтыя стравы на тыдзень у сваё меню. Сярод іх як установы, якія спецыялізуюцца на беларускіх стравах, так і тыя, што ў звычайныя дні прапануюць еўрапейскую кухню. Гэта цікава і мінчанам, якія сочаць за абвесткамі і спецыяльна прыходзяць пакаштаваць нашы нацыянальныя стравы.

Пастаянны аўтар «Звязды» (ён жа Кухмістр Верашчака), гісторык беларускай кухні Алесь БЕЛЫ такую падзею ў сферы грамадскага харчавання, натуральна, не пакінуў па-за ўвагай. Аднак ён выказаў некаторыя прапановы па ўдасканаленні тыдня беларускай кухні:

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У гэтай акцыі, якая праходзіць ужо не першы раз, я бачыў вельмі мала страў з сапраўды яркай беларускай генеалогіяй. Ні разу не прайшлі на гэтых тэматычных тыднях бульбяная кішка, сальцісон, верашчака, цэпеліны, грыбны квас, крупнік, халаднік, вантрабянка і многае іншае, што мае багатую літаратурную гісторыю. Да таго ж не відаць уплыву календара, да якога здаўна звярталіся на Беларусі. Калі, напрыклад, гэты тыдзень праводзілі б на Дзяды (што было б лагічна), то былі б там бліны, розныя клёцкі, тая ж верашчака, грыбны квас, крупнік і г.д. А калі б на Каляды — то боршч з вушкамі, капуста тушаная, куцця, ламанцы-сліжыкі і многае іншае. Лічу, што, ладзячы такія тыдні традыцыйнай кухні, трэба звяртацца да рытму традыцыйнага календара, шматвяковых звычаяў, літаратуры, гісторыі.

Падаецца, рыхтуючыся да наступнага тыдня беларускай кухні, арганізатары маглі б звярнуцца не толькі да суполкі сучасных прафесійных кухараў, але і да гісторыкаў-экспертаў, якія б дапамаглі скіраваць тыдзень беларускай кухні да больш аўтэнтычнага выгляду. Алесь Белы раіць таксама звяртацца да вопыту іншых краін у іх папулярызацыі нацыянальнай стравы:

— Калі возьмем, напрыклад, Ірландыю, то там у любы дзень ва ўстанове, якая пазіцыянуе сябе як нацыянальная, будзе, пэўна, мінімум 3-4 стравы з топ-5: ірландскае рагу Irish stew, bacon and cabbage (далёкі сваяк нашага бігаса), boxty (сваякі дранікаў), рагу coddle і colcannon. 7-10 страў з топ-20: дадасца аўсянае печыва, гарачая страва з бараніны, ірландская кава і іншае. І, вядома, у кожным будзе яшчэ і нешта сваё, якога ў большасці іншых рэстаранаў няма, але таксама ірландскае. Аднак у нас праблема якраз і заключаецца ў тым, што ніхто не ведае, якімі павінны быць гэтыя беларускія топ-5 і топ-20. У Ірландыі яны прайшлі шматвяковы адбор народных сімпатый, а ў нас гэты працэс быў гвалтоўна перарваны. І ніякім загадамі гэты працэс творчасці і натуральнага рынкавага адбору не замяніць.

Карэспандэнт «Звязды» звярнулася таксама і **да шэф-повара, удзельніка «Суполкі кухараў» Аляксандра ЧЫКІЛЕЎСКАГА**, каб даведацца, якім чынам ён падбіраў стравы для тыдня беларускай кухні. Цікава, што адна з крыніц, да якой ён звяртаўся ў сваім адборы, гэта акурат кніга Алеся Белага «Наша страва». Яе шэф-повар лічыць адной з вызначальных для сучаснай беларускай кухні. Да таго ж Чыкілеўскі карыстаўся іншымі выданнямі, сваімі запісамі, атрыманымі падчас экспедыцый па Беларусі (з мэтай занатавання складнікаў і спосабаў прыгатавання аўтэнтычных страў), а таксама рэцэптамі, запісанымі яшчэ ад сваіх бабуль і прабабуль. Шэф-повар дадаў:

— Менавіта гэтыя стравы для меню тыдня беларускай кухні мы выбралі з-за пэўнага эканамічнага падтэксту — каб яны былі не надта дарагімі. Напрыклад, зразы, фаршыраваныя квашанай капустай, стравы з грыбамі — менавіта цяпер усё гэта даступна і даволі танна. Аднак я таксама не прыхільнік таго, каб тыдзень беларускай кухні праводзілі па адзінай рэцэптуры і цэнах. Яго можна было б зрабіць больш цікава. Не варта строга абмяжоўваць рэстаратараў. Трэба шэф-павара тых устаноў, якія спецыялізуюцца на нацыянальнай кухні, даць магчымасць выбраць, якую страву яны хочуць прыгатаваць, каб сапраўды здзівіць сваіх наведвальнікаў. Калі ж гэта неспецыялізаваная ўстанова, няхай яны гатуюць дранікі, але аўтарскія, каб нечым яны былі асаблівымі і запамінальнымі.

Наступны тыдзень беларускай кухні ў Мінску, як мяркуецца, пройдзе ў канцы зімы — пачатку вясны 2015 года.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Партрэт мастака

З ЯКІМАВАЙ СЛАБАДЫ — У ПАРЫЖ

Тэлефонны званок застаў мяне ў садзе ля нашага лецішча. «Можа, усё ж не ехаць у гэты Парыж? — пазнаў голас мастака Сяргея Каваля. — Мне і тут добрых тэм хапае... Як лічыце?» Міжволі прыгадаліся яго даўнія словы: «Сонца вакол аднолькавае. Прырода — як першакрыніца пазнання. Усё натуральнае — бескарыслівае. І прырода бескарыслівая таксама...» Я азірнуўся вакол: блізкі лес з водарам бачнай нават адсюль Бярэзіны, старажытныя курганы... Сапраўды прыгожа! Ды і ў яго роднай вёсцы такой прыгажосці хапае. Можа, яшчэ і лепшай. Але ж зусім нядаўна Сяргей выказваў занепакоенасць, што не паспее да ад'езду аформіць замежны пашпарт. І вось цяпер... «Трэба адзін раз з'ездзіць хоць бы для таго, каб потым не хацелася», — паспяшаўся я адказаць. Дзесьці ў Якімавай Слабадзе пачуўся знаёмы добразычлівы смех мастака: «Хіба што так.... Ну, добра, пераканалі...»

Даўно ведаю Сяргея. І кожны раз, сустракаючыся з ім, заўсёды думаю, што сапраўдны мастак заўжды захоўвае вернасць свайму дзяцінству. Гэта надае творам шчырасць і першаснасць светаадчування, без чаго проста немагчыма ўявіць выяўленчае мастацтва. Асабліва такое датычыцца жывапісцаў, якія спавядаюць інсітнае, або наіўнае, мастацтва. І нічога крыўднага няма ў тым, што іх час ад часу называюць прымітывістамі. Менавіта яны нібыта сінтэзуюць традыцыйную народную творчасць (лубок) і тое, што лічыцца наіўным рэалізмам. Імкненне да прастаты, але не да спрошчанасці, лаканізм выяўленчых сродкаў, яркая расфарбоўка, разлічаная звычайна на зрокавы эфект, тлумачальныя надпісы... Гэта далёка не поўны пералік асаблівасцяў такой мастацкай творчасці. Да яе нярэдка звярталіся майстры прафесійнага мастацтва, творча імітуючы тое, што ім здавалася цікавым.

Вось чаму і творы Сяргея Каваля адразу ж звярнулі на сябе ўвагу падчас калектыўнай выставы мясцовых мастакоў у карцінай галерэі «Традыцыя» імя Германа Пранішнікава. Яго «Дзяўчынка з яблыкамі» і «Хлопчык з дзіцячага дома» пазіралі на нас усёй сутнасцю сваіх нялепшых жыццяў. Мастак здолеў сказаць гэтымі сюжэтнымі партрэтамі нават нешта большае, чым увасобіў фарбамі. Нешматколерным, стрыманым каларытам ён перадаў не толькі знешні, але і ўнутраны драматызм сваіх герояў.

Гэта былі першыя творы вясковага мастака, з якімі пазнаёміліся светлагорцы. Мне ж даводзілася бачыць шыкоўны каталог «Святло і цені», выдадзены міжнародным аўтамабільным холдынгам «Атлант-М». З яго і даведаўся, што Сяргей Каваль нарадзіўся ў 1960 годзе, вучыўся ў Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі, затым працаваў будаўніком, грузчыкам, шафёрам... Вярнуўся ў родную вёску. Аказваецца, у Мінску адбыліся дзве персанальныя выставы гэтага мастака. Многія карціны набылі калекцыянеры з Германіі, Францыі, Бельгіі, Расіі.

Насуперак агульнай думцы, што любімым мастаком яго павінен быць Пірасмані, Сяргей Каваль назваў Пабла Пікаса. І гэта пры тым, што не толькі тэматычна, але і духоўна ўсёй сваёй сутнасцю ўвасабляе народныя ўяўленні аб выяўленчым мастацтве. Не дзіўна таму, што многія творы (а яны вельмі праставыя) прысвечаны сялянскаму жыццю, побыту. Неяк сапраўды па-дзіцячы шчыра перадае ён сваё адчуванне роднай прыроды, дакладней — гармоніі з ёю. Яго вясковыя фантазіі вельмі рэалістычныя, хаця і стылізаваныя. Мне здаралася чуць ад аўтара прозвішчы, імёны тых, каго мы бачылі ў карцінах. Аднак майстэрства вольнай, нязмушанай кампазіцыі ў кожнай з іх проста захапляе. І тым не менш, адчуваецца менавіта тая цэласнасць, якую нельга парушыць. Маленькія, мініяцюрныя героі яго твораў, здаецца, надзелены толькі ім уласцівымі лёсамі, характарамі, — так і хочацца сказаць, ролямі, якія яны «выконваюць» у той ці іншай карціне. Варта нешта змяніць — і знікне ўся істотнасць задумы, увасаблення. Пазбаў аднаго з герояў — і ўсё рассыплецца. А якая непасрэднасць, шчырасць, свабода! Не напісана, а выдыхнута чыстымі, адкрытымі колерамі. Рэдкія ўмоўныя цені толькі пацвярджаюць гэта...

Было б, аднак, наіўным лічыць яго наіўнае мастацтва абмежаваным ад усіх і ад усяго. Не толькі Пірасмані, але і многія іншыя славутыя мастакі прыгадваюцца, калі гартаеш каталог «Святло і цені». Гэтага не ўтойвае і сам Сяргей Каваль. Вось некаторыя назвы яго карцін, якім ён надае асаблівую асацыятыўную значнасць: «Размова з прыяцелем Моцарта», «Падарожжа ў нікуды» (інтэрпрэтацыя карціны Сальвадора Далі «Аптэкар з Фігераса, які не шукае абсалютна нічога»), «Першы снег. Сон Пірасмані ў «Райскім садзе» Босха», «Падарожжа Хуана Міро і Пабла Пікаса ў Афрыку». Гэта далёка не поўны пералік, бо прыгадваюцца такія славутыя мастакі, як Сар'ян, Мадзільяні, Суцін... Ён піша копіі твораў Цімура Сюдзана, Масанобы, Пікаса, прыгадвае Шэкспіра, Хемінгуэя, прысвячае свае мастакоўскія фантазіі Анры Мацісу... Як бачым, асацыятыўная маштабнасць — навідавоку. Майстэрства Сяргея Каваля настолькі натуральнае, што застаецца непрыкметным. А гэта яскравае сведчанне сапраўднай таленавітасці. Асабіста мне падалося, што многія яго карціны існавалі заўжды. Так думаў, калі ўзіраўся ў «Калядную ноч», у «Сны майго горада», «Райскі сад», эскіз габелена «Венецыя», «Касмічную адысею», у партрэты жанчын розных краін свету.

Цыкл карцін (і гэта таксама для яго вельмі натуральна) прысвечаны дзецям. У іх Сяргею Кавалю не давялося адмаўляцца ад сваіх асноўных стылёвых асаблівасцяў. Хіба толькі «дзіцячасці» — яркай, захапляльнай — значна больш («Лета ў вёсцы», «Лепшыя на свеце», «Райскі востраў», «Русалка на востраве Чунга-Чанга»). І ўсё ж асабліва пранікнёна праявіў сябе мастак у шматпланавых, шматлюдных (так і хочацца сказаць, шматсюжэтных) карцінах, прысвечаных роднай вёсцы і Светлагорску («Мая родная вёска Якімава Слабада», «Сенакос», «Стары Светлагорск», «Мая вуліца»). Дзве апошнія з іх ён ахвяраваў карціннай галерэі «Традыцыя».

А праз некалькі дзён, калі завіталі да мастака, ён сустрэў нас выставай, якая размясцілася ў дварэ селішча. Вялізныя шматлюдныя карціны маляўніча «апранулі» сабой не толькі сцены хаты ды стопкі, але і вароты, плот... Пазнавальнасць гістарычных асоб, нейкая жартаўлівая сур'ёзнасць задумы, усё тая ж па-дзіцячы наіўная шчырасць і яшчэ нешта такое, што набліжае прасторавыя творы да знакамітых карцін Ільі Глазунова, але гэтак жа адрознівае іх. Ды і назвы быццам бы зусім не для твораў прымітывізму: «Спакушэнне», «Цені і зладзеі», «Сацыяльныя мутацыі», «Эрас — сублімацыя пачуццяў», «Прысвячэнне Аляксею Жданаву»... Так, то быў своеасаблівы працяг арт-праекта «Zabor», толькі ўжо не ў Парыжы, а ў Якімавай Слабадзе.

Творчы партрэт Сяргея Каваля будзе няпоўным, калі не сказаць, што на яго мастакоўскім рахунку шэраг ікон («Дзева Марыя», «Ісус Хрыстос», «Мікалай Цудатворац» і іншыя). А яшчэ ён захапляецца і драўлянай скульптурай. Зноў жа тэматычны дыяпазон іх самы разнастайны, але галоўным застаецца яго шчырае, прасякнутае таленавітай наіўнасцю, першапачуццёвае адчуванне мастацтва.

Мне даводзілася бачыць рэпрадукцыі карцін Сяргея Каваля ў штотыднёвіках «Культура», «Літаратура і мастацтва», газеце «СБ. Беларусь сегодня». Ведаю, што ён прадстаўлены ў альбоме мастака і эсэіста Юрася Малаша «Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі», прэзентацыя якога адбылася ў выставачным комплексе гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе». Дарэчы, у мастацкім фондзе яго ёсць 6 твораў і Сяргея. Дадам толькі, што вядомасць гэтая ў вёсцы Якімава Слабада пакуль не адчуваецца. І справа не ў тым, што ён не мае спецыяльнай адукацыі. Усе знакамітыя прадстаўнікі прымітывізму былі самавукамі: і Пірасмані, і бабуля Мозес, і Марыя Прымачэнка...

А мастак сапраўды ўмее ствараць фарбамі легендарна-казачнае мроіва, якому проста нельга не верыць. І ўсё ж па-сапраўднаму вялікую ўвагу звярнуў ён на сябе пасля таго, як стаў удзельнікам арт-праекта «Zabor» па выніках конкурсу, у якім прынялі ўдзел 94 мастакі. Яго вясёлыя, па-дзіцячы шчырыя інсітныя творы вельмі добра ўпісваліся ў неабмежаваныя прасторы вулічных выстаў на працягу двух вандроўных гадоў па Беларусі.

Не згубіліся творы Сяргея Каваля і на выставе ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Больш за тое, яму адвялі асобную залу, у якой размясціўся дзіцячы пакой, дзе валанцёры наладзілі своеасаблівыя творчыя майстэрні, арганізавалі гульні і інтэрактыўныя экскурсіі для маленькіх наведвальнікаў. Зрэшты, вось што гаворыць аб гэтым Ірына Кандраценка: «У нашай экспазіцыі ёсць цудоўны мастак-прымітывіст Сяргей Каваль, працы якога літаральна прасякнуты духам дзіцячай творчасці. На яго палотнах шмат персанажаў, якія могуць быць цікавымі як дарослым, так і дзецям; і хутчэй — апошнім. Таму мы вырашылі зрабіць дзіцячую залу, у якой экспанаваліся карціны Сяргея, а дзеці змаглі сябе паспрабаваць у ролі юных мастакоў. Тут мы і прапанавалі розныя тэхнікі малявання. Да таго ж вялікія кубы-пазлы далі магчымасць скласці адну з яго карцін «Стары Віцебск», а малады рэжысёр Раман Бурмакоў спецыяльна для выставы «ажывіў» яе, зрабіўшы мультфільм».

«Стары Віцебск»

...Час парыжскай вандроўкі прайшоў вельмі хутка. І вось сядзім у гасціннай вясковай хаце Сяргея Мікалаевіча. Расказвае ён, нібыта сам услухоўваецца ў свой голас, здзіўляючыся таму, што з ім адбылося ў французскай сталіцы, дзе ўздоўж ціхай вулачкі Анры Марціна, усяго за некалькі кварталаў ад Эйфелевай вежы (а гэта раён, дзе знаходзяцца больш за 90 замежных дыпламатычных прадстаўніцтваў, у тым ліку і беларускае) былі размешчаны рэпрадукцыі твораў 8 беларускіх мастакоў — Віктара Альшэўскага, Руслана Вашкевіча, Юрыя Якавенкі, Уладзіслава Стальмахова, Сяргея Грыневіча, Віталя Дзенісенкі, Аляксандра Дасужава і Сяргея Каваля, які прадставіў «Стары Віцебск», «Яўрэйскі квартал у Бабруйску», «На вуліцы Даўмана», «Казкі Мірскага замка».

Пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка, дзякуючы якому і адбылася гэтая паездка, многае нагадаў на афіцыйным прыёме ў мэрыі 16-й акругі Парыжа. Мэта — пазнаёміць патрабавальнага французскага гледача з беларускім выяўленчым мастацтвам. А беларуская культура на працягу свайго развіцця з'яўлялася часткай еўрапейскай культурнай прасторы.

Зрэшты, на афіцыйным прыёме Сяргея Каваля не было. Ён заблукаў у Парыжы і амаль суткі захоплена «вандраваў» па горадзе сваёй колішняй мары. Можна ўявіць сабе, колькі хваляванняў даставіў сваёй адсутнасцю арганізатарам паездкі. Але сам Сяргей толькі збянтэжана ўсміхаецца: «Я стаў удзельнікам нейкага містычнага свята і забыўся. Ведаеце, перад ад'ездам трохі сумняваўся: маўляў, калі ў думках пабываў у Парыжы, дык навошта туды ехаць? А тут ноччу ля агністай Эйфелевай вежы сапраўдны нейкі карнавал жыццёвай асалоды. Кожны нешта імітаваў, уяўляў сябе ў нейкай ролі... І я таксама штосьці маляваў у паветры і адчуваў сябе чалавекам Сусвету...» Між іншым, нават блукаючы пасля па вуліцах і плошчах, адзінокім, напэўна, не быў, бо адчуваў прысутнасць дзесьці побач Пушкіна, Ясеніна, Рэмбо, Шагала... А яшчэ прыгадваў словы аб тым, што Парыж занадта прыгожы, каб быць сапраўдным... Ды ўсё ж самай памятнай падзеяй лічыць Сяргей Мікалаевіч наведванне Луўра, сустрэчу з Джакондай Леанарда да Вінчы, з творамі Мікеланджэла, Яна ван Эйка, Рубенса, Рэмбранта...

Ужо развітваючыся, неяк зусім ціха прызнаўся: «Цяпер я магу маляваць Парыж, як Шагалі і Якімаву Слабаду».

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ

УП ИНСТИТУТ «БЕЛПРОМСТРОЙПРОЕКТ»
приглашает принять участие в переговорах
по выбору субподрядной организации для выполнения раздела «геологические и геодезические изыскания» по объекту: «Административное здание на территории аэродрома «Липки» 2-я очередь. Инженерные сети.
УНП 100049147

ОАО «БЕЛХИМ»
приглашает принять участие
в процедуре переговоров по выбору подрядной организации для прокладки линии ВОЛС на участке АТС 203 – ул. Короля, 34 в г. Минске.
Предложения принимаются до 09.00 17.11.2014 г. по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34, каб. № 3.
Справки по тел. 8017 306 20 00, факс 8017 200 51 86.
УНП 100122846

УП ИНСТИТУТ «БЕЛПРОМСТРОЙПРОЕКТ»
приглашает принять участие в переговорах
по выбору субподрядной организации для выполнения раздела «геологические и геодезические изыскания» по объекту: «Строительство производственного цеха по производству гибкой полимерной теплоизолированной трубы» ОАО «Речицкий завод «Термопласт».
УНП 100049147

Объявление от 05.11.2014 об утере представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланка страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛ № 0559794 **считать недействительным. Утерянным** считать бланк полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0559794.
УНП 100122726

УНП 190415332
ООО «Центр реализации недвижимости» (Организатор аукциона)
*Уточняет данные к объявлению, опубликованному **05 ноября 2014 года** в газете «Звязда», о сроках регистрации потенциальных участников, а также адрес месторасположения объекта аукциона.*
Заявления с комплектом документов на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 117А, 12 этаж, с 9.00 до 18.00 в рабочие дни по 17 ноября 2014 года включительно.
Объект аукциона расположен по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, д. 43, корп 1.
Более подробную информацию об объекте аукциона можно узнать в №188 (27798) газеты «Звязда» от 03 октября 2014 года, а также по следующим контактным данным:
ООО «Центр реализации недвижимости»:
Минск, просп. Независимости, 117А, 12 этаж.
Тел. (+375 17) 385 24 65, e-mail: Osipov_ivan@uniter.by.

ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

17 декабря 2014 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение – строительство	Качество земли	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ	Срок аренды, лет	Начальная стоимость, бел. рублей	Сумма задатка, бел. рублей	Затраты на подготовку документации, бел. рублей
1	в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 3 по генплану)	340100000008003689	0,7277	для строительства и обслуживания здания специализированного розничной торговли (универсам), (объект розничной торговли)	к землям сельскохозяйственного назначения не относятся	Ограничений в использовании нет.	40	552 919 800	110 583 000	3 207 824
2	в районе усадебной застройки «Романовичи» (позиция № 4 по генплану)	340100000008003690	0,2117	для строительства и обслуживания здания специализированного общественного питания (объект общественного питания)		Ограничений в использовании нет.	40	160 853 600	32 170 000	2 823 210
3	в районе улиц Физкультурная-Технологическая	340100000002003852	0,1745	строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров		Ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений канализации - 0,0525 га, охранная зона сетей и сооружений газоснабжения - 0,0184 га.	25	209 346 450	41 869 000	3 204 123
4	район усадебной застройки Прибор, на пересечении улиц Телешовской и Тереничской (уч. № 19 по ул. Телешовской и № 15 по ул. Тереничской)	340100000006004751	0,2566	строительство и обслуживание здания специализированного розничной торговли (объекта розничной торговли)		Ограничений в использовании нет.	25	31 630 200	6 326 000	2 424 551
5	микрорайон № 18, позиция 49 по генплану	340100000001005503	0,5197	для строительства и обслуживания здания специализированного физкультурно-оздоровительного назначения с объектами общепита (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения)		Ограничений в использовании нет.	25	1 139 867 400	227 973 400	9 605 029
6	в районе ул. Барыкина-Войсковой	340100000005006638	0,4800	для строительства и обслуживания здания специализированного по ремонту и техническому обслуживанию автомобилей и (или) магазина непродовольственных товаров (земельный участок для размещения оъектов неустановленного назначения)		Ограничения в использовании – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения площадью 0,0019 га	30	838 196 850	167 639 350	11 167 470
7	ул. Войсковая, 14 а	340100000006004974	0,2838	для строительства и обслуживания здания специализированного по ремонту и техническому обслуживанию автомобилей и (или) автомойки, и (или) шиномонтажа или производственно-складских помещений (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения)		Ограничения в использовании – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения площадью 0,0724 га, охранная зона линий электропередач напряжением свыше 1000 вольт площадью 0,0040 га. Условия: согласование проектно-сметной документации с городским узлом электросвязи, ГФРУПЭ «Белтелеком», с собственниками водопровода	30	250 901 550	50 180 000	11 110 657
8	ул. Севастопольская, 151	340100000007006490	0,0978	для строительства и обслуживания магазина (земельный участок для размещения объектов розничной торговли)		Соблюсти противопожарный разрыв, вынести распределительный газопровод из пятна застройки, вынести электрические сети 0,4 кВ.	30	164 829 200	32 965 800	10 095 611
9	в районе озера Любенское	340100000006004882	0,0150	для размещения лодочной станции и организации услуг проката водного транспорта (земельный участок для размещения объектов иного назначения)		Ограничения в использовании – прибрежная полоса озера Любенское.	1	2 376 500	475 200	1 901 560
10	микрорайон № 104	340100000007006405	0,2800	для строительства здания специализированного общественного питания (земельный участок для размещения объектов общественного питания)		Ограничения в использовании в связи с расположением в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (сетей и сооружений канализации) площадью 0,0450 га	50	424 870 550	84 974 100	11 327 232
11	ул. Кунцевича, в районе жилых домов 37, 39, 41	340100000004001309	0,1566	для строительства и обслуживания магазина (земельный участок для размещения объектов розничной торговли)		Ограничений в использовании нет.	30	200 314 000	40 000 000	11 417 740

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности горисполкома.
2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462, а также в соответствии с Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 607 «О внесении дополнений и изменений в некоторые постановления Совета Министров Республики Беларусь по вопросам проведения аукционов, конкурсов». Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту.
3. **Аукцион состоится 17 декабря 2014 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в управление коммунальной собственности в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на р/с 3642402000226 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности горисполкома. Кроме того представляют:
4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
